Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыя—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Натар'яльныя прымаюцца—з 9-й да 3½ гадз.

Незапатрабаваныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • 2 р. 70 к. • 6 • 4 р. — к. • 1 год 8 р. — к. Зьмена адрасу: гарадзкога — 20 к. месцовага — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапкарэй пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапкарэй апярэдзе тэксту 1 р. — к. За радок шапкарэй перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпецыяльна ад 50 проц. дарожэй. Зьмы сьмерфу біржэцка 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радок . . . 35 коп. За кожны радок . . . 15 • Беспрадпл. і чырвонаармейцы за радок . . . 15 • За кожны радок . . . 5 • Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЮЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Белдарпошты і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 292 (2480 Чэцьвер, 20-га сьнежня 1923г.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ--МАЯК ДЛЯ ПАДНЯВОЛЕНЫХ ЗАХАДУ.

Прывітаньне працоўным БССР ад т. Рудзутака.

МАСКВА. У зьвязку з 10-цігодзьдзем БССР намесьнік старшыні СНК і Савету Працы і Абароны СССР т. Рудзутак зьвярнуўся да працоўных БССР з прывітаньнем, у якім зазначана: «10 гадоў гаспадарчага і культурнага росту Савецкае Беларусі абярнулі гэты падняволены і прыгнечаны пры царызьме і зруйнаваны ў часе вайны край у моцны аванпост СССР на яго заходняй мяжы.

Савецкая ўлада разьняволіла прыгнечаныя народнасьці Беларусі, стварыўшы замест ранейшага нацыянальнага прыгнечаньня і пагромаў шырокія ўмовы для гаспадарчага і культурнага супрацоўніцтва ўсіх народнасьцяй, якія жывуць на Беларусі. Гэтым самым БССР робіцца для падняволных народнасьцяй заходніх краёў, як і для шырокіх рабочых і сялянскіх мас Заходняе Эўропы, узорам сацыялістычнае перабудовы краёў найбольш адсталых у гаспадарчых і культурных адносінах і прыкладам правільнага разьвязваньня пралетарыятам нацыянальнае праблемы.»

Цьвёрдалобыя мала чаму навучыліся.

СПРЭЧКІ Ў ПАЛАЦЕ ВОБШЧЫН ПАКАЗАЛІ, ШТО ЎРАД БАЛЬДВІНА ДАЛЁКІ АД АДНАЎЛЕНЬНЯ ЗНОСІН З СССР.

ЛЁНДАН, 18-XII. На пасяджэньні палаты вобшчын член рабочае партыі Пансонбі (намесьнік міністра замежных спраў у габінэце Макдональда) зьвярнуўся да прем'ера Бальдвіна з запытаньнем, ці зьвярнуў Бальдвін увагу на прамову Літвінава ў Маскве 11-га сьнежня, прысьвечаную пытаньням замежнае палітыкі савецкага ўраду. Пансонбі падкрэсьліў, што ў гэтай прамове зазначалася на прынцып няўмешваньня ва ўнутраныя справы іншых краёў, як на основу існуючых гандлёвых і дыпляматычных зносін між Расеяй і іншымі краінамі. У зьвязку з гэтым Пансонбі пытае, ці гатоў урад абмеркаваць аднаўленьне дыпляматычных і гандлёвых зносін з савецкім урадам на аснове гарантыі, што ўстаўленьне такіх зносін будзе ісьці побач з захаваньнем прынцыпу няўмешваньня ва ўнутраныя справы Англіі.

З адказам выступіў Чэмберлен, які заявіў: урад ня лічыць, што прамова Літвінава ўносіць якія-небудзь зьмены ў існуючае становішча.

На запытаньне дэпутата рабочае партыі Кенворці — „паскольку нам належала ініцыятыва разрыву зносін з Расеяй, ці ня зьяўляецца нашым абавязкам выказаць ініцыятыву ў справе палепшаньня іх", а таксама дэпутат рабочае партыі Тэйлёра—„ці будзе прызнаньне расейскіх абавязацельстваў у справе даўгоў і канфіскацый, водгук апошняга артыкулу гандлёвага ўгавору 1921 г., здавальняючай базай для пачатку перамоў пры ўмове катэгарычнага абавязацельства на весьці прапаганды»—Чэмберлен адказаў: «Думаю, што найбольш важнае ня ў тым, каб мы мелі катэгарычнае абавязацельства ў пытаньні аб прапагандзе, але таксама і довад за тое, што гэтае абавязацельства будзе выконвацца».

На запытаньне дэпутата рабочае партыі Тэрля, якім паралкам можа быць праверана добрасумленнасьць уплыву на сабе абавязацельства, пакуль зносіны не адноўлены, Чэмберлен адказвае: «Пасьля таго, як дзейнасьць, на якую мы скардзімся, будзе спынена, мы абмяркуем пытаньне, каб адновіць зносіны».

АНГЛІЯ АБЛЧЫЛАСЯ.

ТАШКЕНТ, 18-XII. Абмяркоўваючы прамову сакратара Чэрчыля Бутбі, газэта «Туфан» піша: «Англія, якая раней ужывала ўсе захады, каб скінуць савецкую ўладу, зараз вымушана з-за эканамічных меркаваньняў адновіць зносіны з СССР».

Вайна між Балівіяй і Парагваем.

ЛІГА НАЦЫЙ ЯШЧЭ РАЗ ДЭМАНСТРАВАЛА ПЕРАД СЬВЕТАМ СВАЮ БЯСЬСІЛАСЬЦЬ.

НЬЮ ЁРК. Вайсковае міністэрства Парагваю паведамляе, што балівійцы захапілі 4 парагвайскіх прыгранічных пункты, з якіх 3 парагвайскае войска адабрала назад. Далей паведамленьне міністэрства зазначае, што балівійскія самалёты бамбардыруюць парагвайскую тэрыторыю.

* * *

ПАРЫЖ, 18-12. Агенцтва Гаваса паведамляе: „Брыян, генэральны сэкратар Лігі Нацый Дэмонд і прадстаўнікі Францыі і Японіі абмяркоўвалі канфлікт між Балівіяй і Парагваем. Удзень Брыян спаткаўся з пасланьнікамі Балівіі і Парагваю, арґентынскім паслом і дэвераным у справах Злучаных Штатаў. Брыян дамагаўся патрэбы знайсьці абавязкова мірны спосаб упарадкаваньня канфлікту і заявіў, што рада Лігі Нацый згадна далучыцца да любога мірнага вырашэньня».

* * *

НЬЮ-ЁРК, 18-XII. Водгук паведамленьню «Асошыэйтэд Прэс», Балівія абвясьціла, што яна згодна на пасрэдніцтва пан-амэрыканскае арбітражнае канфэрэнцыі, пасяджэньні якое адбываюцца зараз у Вашынгтоне. У адказе Ліве Нацый балівійскі ўрад паведаміў, што ён згадаў войску на фронце прыпыніць наступ проці парагвайскага войска.

Вайсковае міністэрства Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў адхіляе парагвайскае паведамленьне, пібы балівійскае войска захапіла 4 парагвайскія пункты.

* * *

ВАШЫНГТОН, 18-XII. Келёг заявіў, што Амэрыка ня думае ўмешвацца ў канфлікт між Балівіяй і Парагваем. Урад Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, як відаць, мяркуе дзейнічаць праз пасрэдніцтва пан-амэрыканскае арбітражнае канфэрэнцыі, жадаючы пазбавіцца магчымае стычкі між дастрыкаю Монроэ і Лігай Нацый.

Амэрыканскі друк, абмяркоўваючы канфлікт, выказваецца проці ўмешваньня Лігі Нацый. Газэта «Журналь Оф-Камэрс» падкрэсьлівае бясьсільасьць Лігі Нацый у гэтым канфлікце між двума яе членамі.

Сялянскае паўстаньне ў Хэнані.

ГОРАД ЛІНСЯН У РУКАХ ПАЎСТАЎШЫХ.

ПЕКІН, 18-XII. Агенцтва Говэнь паведамляе, што атрады сялянскага тайнага таварыства «нябесная брама» ў сьнежні адналі бялыя аперацыі і захапілі павятовы горад Лінсян, які знаходзіцца ў паўночнай частцы Хэнаньскае правінцыі (Лінсян заўсёды лічыўся галоўным апорным пунктам т-ва). Водгук слоў агенцтва, Фыў-Юй-Сян мяркуе ў бліжэйшы час паслаць карную экспэдыцыю проці паўстанцкіх атрадаў.

2-я ЎСЕКІТАЙСКАЯ АНТЫЯПОНСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ.

ПЕКІН, 18-XII. 10-га студзеня ў Пекіне адбудзецца другая ўсекітайская антыяпонская канфэрэнцыя.

АДНАВІЛА ПРАЦУ КОНСУЛЬСТВА ЗЛ. ШТ. У НАНКІНЕ.

ШАНХАЙ, 17-XII. У Нанкіне аднавіла дзейнасьць консульства Злучаных Штатаў, якое было зачынена в часу нанкінскага інцыдэнту (люты 1927 г.).

ВЕШАЦЕЛЬ МАНЧЖУРСКАГА СЯЛЯНСТВА—ЗАЎЗЯТЫ ПРЫЯЦЕЛЬ ГАМІНДАНУ.

ПЕКІН, 18-XII. Мясцовы друк паведамляе, што Чжан-Сюэ-Лян адмовіўся вярнуць нацыянальнаму ўраду рукавы склад Пекін-Мукдэнскае чыгункі, пакуль ня будуць упарадкаваны ўсе палітычныя пытаньні пакоя Манчжурыі.

НЕДАГАВОРАНАСЬЦЬ МІЖ НАНКІНАМ І МАНЧЖУРСКІМ САТРАПАМ.

ПЕКІН, 18-XII. Агенцтва Говэнь паведамляе, што Чжан-Сюэ-Лян прапануе 90 мукдэнскім студэнтам пекінскае вайсковае акадэміі зараз-жа ўступіць у акруговую арганізацыю Гаміндану. Водгук слоў агенцтва, Чжан-Сюэ-Лян заявіў, што ў бліжэйшы час усім вайсковым і цывільным чынам Манчжурыі будзе прапанавана далучыцца ў Гамінадан.

УЗМАЦНЕНЬНЕ РУХУ ПРОЦІ ГАБІНЭТУ ТАНАКА.

ТОКІЁ, 18-12. Лявіцейная партыя Мінсэйто агаласіла брашуру, у якой востра ганьбіць кітайскую палітыку сучаснага ўраду. Брашура кажа, што цікавым для Японіі пытаньні ў Манчжурыі і Манголіі ў выніку памылковае палітыкі ўраду ўжо не вырашаюцца японскімі пытаньнямі і абмяркоўваюцца ў міжнародным. Брашура крытыкуе спрыяльны адносіны ўраду да так званае „лесла-японскае Антанты", далажыў, што Японіі неабходна падтрыманьне Англіі, Японія правінна ісьці сваім шляхам".

Гаворыцца, брашура зазначае, што палітыка сучаснага ўраду выклікала ва ўсім сьвеце занадзорванасьць у адносінах да Японіі, стварыла проціяпонскі рух у Кітаі і прывяла да патраты 700 мілёнаў іен на ўтрыманьне японскага войска ў Кітаі, а таксама да мабілізацыі 40.000 салдат.

«Адзіны спосаб палепшыць японска-кітайскія дачыненьні, - кажа ўрэшце брашура,— гэта скінуць сучасны ўрад».

ТАНАКАМІ—УРАДАВЫ ЭМІСАР У КІТАІ.

ТОКІЁ, 18-12. Падарожжа ў Кітай Танакамі—лідэра ідэйна заснаванае і блізкае да ўраду партыі Сэйто-Курабу ня сьпяшае пакінуць японскі друк. У друку неадступна вынуваюцца чуткі, што Танакамі —эмісар японскага ўраду, якому даручана высьветліць умовы згоды з Кітаем

8-мы усесаюзны зьезд прафсаюзаў

Патрэбен адзіны фронт РСІ і прафсаюзаў ДЛЯ АЧЫСТКІ АПАРАТУ АД ВАРОЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ

За мінулы год біржамі паслана на працу 5 млн. чалавек.

Прафсаюзы—рэзэрв для папаўненьня РСІ.

МАСКВА, 18-XII. На ранішнім пасяджэньні зьезду прафсаюзаў 18 га сьнежня выступіў у спрачках аб дакладзе Арджанікідзе член калегіі НК РСІ т. Багановіч, які зазначыў, што ў галіне рацыналізацыі нашае прамысловасьці зроблена яшчэ вельмі мала. Асобныя факты паказваюць, што рацыналізацыя дасьць нам вялікія вынікі на прадпрыемствах Азнафты, капрылах, дзякуючы рацыналізацыі, прадукцыйнасьць працы узьнялася на 226 проц., выпуск прадукцыі на 165 проц., а заработак павялічыўся ледзь не на 100 проц. Тав. Багановіч зазначае далей, што пры рацыналізацыі скуранае прамысловасьці можна з'эканоміць у працэнту году 55 мілёнаў руб., пры рацыналізацыі бавоўняна-пряснае прамысловасьці—99 мілёнаў руб. і г. д.

Амаль усе выступаўшыя ў спрачках дэлегаты спыняліся на пытаньнях чысткі савецкага апарату. Большасьць дэлегатаў лічыць, што патрэбна рашуча ўзяцца за чыстку савецкага апарату, выкінуўшы адтуль чужы і варожы савецкай дзяржаве элемэнт. Да гэтае справы трэба прыцягнуць прафэсыянальныя арганізацыі. Дэлегаты асабліва падкрэсьлівалі тую акалічнасьць, што шмат якія завольныя бюракраты, ранейшыя чыноўнікі і паны зараз жа прыладжваюцца ў іншых савецкіх установах. З гэтым трэба рашуча пакончыць.

Далей выступаўшыя ў спрачках прамоўцы казалі аб нездавальняючай узаемнай сувязі між органамі НК РСІ і прафсаюзамі.

Тав. Арджанікідзе ў сваім заключным слове падкрэсьліваў, што толькі супольная дружная праца НК РСІ і прафсаюзаў аздаровіць адміністрацыйна-гаспадарчы і савецкі апарат. Прафсаюзы ня досыць сыстэматычна вялі барацьбу з бюракратызмам і валакітаю ў савецкім апараце. Прафсаюзы ня маюць магчымасьці перамагчы гэтыя недахопы без дапамогі РСІ, але і РСІ можа выканаць усе задачы толькі пры адпаведным падтрыманьні з боку прафсаюзаў, часовых кантрольных камісій, вытворчых нарад і ўсяе рабочае масы.

Адначасна Арджанікідзе закрануе пытаньне аб адсутнасьці ў апараце РСІ патрэбнага кадру вопытных працаўнікоў. Гэтых працаўнікоў павінны нам даць нашыя прафсаюзы. Апарат РСІ павінен быць узмоцнен лепшымі прадстаўнікамі рабочае класы. Тав. Арджанікідзе выказвае ўпэўненасьць, што да будучага 9-га зьезду прафсаюзаў НК РСІ пры дружным падтрыманьні прафсаюзаў даможацца больш значных вынікаў у сваёй працы.

Аб дакладзе Арджанікідзе зьезд уквалю рэзалюцыю, у якой цалком адобрывае дзейнасьць НК РСІ і прапануе прафсаюзам у далейшым браць больш удзелу ў працы органаў НК РСІ, даючы ім усялякую дапамогу і падтрыманьне.

Для канчатковае распрацоўкі рэзалюцыі вылучана камісія ў складзе 33 чалавек.

У СССР каля 10 мілёнаў застрахаваных.

Даклад аб дзейнасьці НК Працы.

Ушанаваньне нязьменнага салдата рэвалюцыйнага прафруху т. Шмідта

МАСКВА, 19-XII. На вячэрнім пасяджэньні зьезду прафсаюзаў 18-га сьнежня выступіў намесьнік старшыні СНК СССР т. Шмідт, які ахарактарызаваў ролю НК Працы ў агульнай сыстэме дзяржаўных органаў Саюзу.

НК Працы,—сказаў тав. Шмідт,—зьяўляецца адным з самых асноўных органаў рабочае дзяржавы. Гэтым ён каранным парадкам адрозьніваецца ад міністэрстваў працы ў буржуазных краёх, якія таксама адыгрываюць дыктатуру і розных клясы, але клясы буржуазеі, разьвязваючы ўсе пытаньні не ў карысьць рабочае класы. НК Працы заўсёды будаваў сваю працу ў шчыльным кантакце з прафрухам. Зьяўляючыся органам дзяржаўнае ўлады, НК Працы павінен быў мець на ўвазе таксама патрабаваньні і інтарэсы гаспадарчых арганізацый. Калі здараліся канфлікты і спрэчкі між прафсаюзамі і гаспадарчымі арганізацыямі, дык НК Працы, які зьяўляецца арбітрам, і пастановы якога канчатковыя, павінен быў злучаць патрабаваньні арганізаванае рабочае класы з агульным становішчам народнае гаспадаркі, ці якое небудзь асобнае яе галіны. Сваю працу НК Працы ў агульным выконваў здавальняюча, а гэта забясьпечыла яму адно з першых і гапаровых мест у агульнай сыстэме савецкіх органаў.

Выступіўшы потым т. Угараў падкрэсьліў, што т. Шмідт быў у працягу 10 гадоў Народным Камісарам Працы. Пацвярджаючы аб яго дарэвалюцыйнай і пасьлярэвалюцыйнай працы ў прафруху, т. Угараў ад імя зьезду выказвае т. Шмідту нажаданьні поўнага посьпеху ў яго далейшай працы на пасадзе намесьніка старшыні СНК СССР (гучныя воплескі).

Справаздачны даклад аб дзейнасьці НК Працы зрабіў намесьнік Наркома Працы т. Таўстаніцкі. Тав. Таўстаніцкі зазначыў, што за апошнія два гады колькасьць застрахаваных павялічылася з 8.158 тысяч да 9.658 тысяч чалавек—павялічэньне на 18 проц. Кантынгент пэнсыянэраў павялічыўся за той-жа час з 609 тысяч да 837 тысяч чалавек - на 47 проц. У 1928-29 годзе страхаваньне старасьці, якое праводзілася пакуль-што толькі ў адносінах тэкстыльшчыкаў, будзе распаўсюджана яшчэ на 3 катэгорыі працы: на чыгуначнікаў, мэталёўцаў і гарнякоў. Усяго да канца 1928-29 году страхаваньне на старасьці ці інвалідзтва, прыблізна, 40 тысяч чалавек.

Цэнтральным пытаньнем у працы НК Працы зьяўляецца пытаньне барацьбы з беспрацоўем. На 1 кастрычніка 1926 г. на біржах працы было зарэгістравана 706 тысяч беспрацоўных, а на 1-га кастрычніка 1928 г. 1.374 тысячы беспрацоўных. Структура беспрацоўя характарызуецца наступнымі данымі на 1-га кастрычніка 1928 г.: чорнарабочых—350 тысяч, служачых—250 тысяч, індустрыяльных рабочых—200 тысяч, будаўнічых —100 тысяч, іншых прафэсій— 120 тысяч і асоб, якія ніколі не працавалі па найму—350 тысяч чалавек. Грашовая дапамога беспрацоўным у 1927-28 г. склала каля 100 мілёнаў руб. У 1926 27 годзе накіравана на працу 3.600 тысяч чалавек, у 27-28 г. —5 мілёнаў чалавек.

Адзначаючы, што колькасьць нішчасных здароўняў у нашай прамысловасьці ўсё яшчэ застаецца вельмі значнаю, т. Таўстаніцкі падкрэсьлівае, што органам НК Працы і прафсаюзаў патрэбна ўжыць усе захады да таго, каб выдаваемыя на охову працы сумы цалком выкарыстоўваліся водгук простага свайго назначэньня. Побач з гэтым трэба палепшыць нагляд над выкананьнем працоўнага заканадаўства.

Начальнік цэнтральнае ўправы страхкас т. Ненчэнка зрабіў даклад аб становішчы сацыяльнага страхаваньня.

КАЛЮМБІЙСКАЯ СТАЧКА ЗАДУШАНА.

НЬЮ ЁРК. З Калюмбіі паведамляюць, што забастоўка на бананавых плянтацыях прыдушана; праца адналася.

У Калюмбіі памёр ад ран, атрыманых у часе нядаўняе стычкі ў зьвязку з забастоўкаю калюмбійскіх садавіных плянтацый, лідэр калюмбійскіх камуністаў Кастрыйён.

Ідзе да ўзброенае разьвязкі...

НЬЮ-ЁРК. 17-12. Камандзір „Амэрыканскага Легіёна" (рэакцыйная арганізацыя ранейшых удзельнікаў вайны) Мак-Нэтт выступіў з пораваю, у якой даводзіў аб патрэбе павялічыць флёт Амэрыкі на выпадак канфлікту з Англіяй. Мак-Нэтт зазначаў, што Англія паслушна дух Вашынгтон кае канфэрэнцыі і пры дапамозе дыпляматычных манэўраў пасьлабіла пазіцыі Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў». Далей Мак-Нэтт заявіў, што ўзмацненьне марское магутнасьці Амэрыкі патрэбна для таго, каб у часе бліжэйшае вайны нейтральнае гандлёвае мораплаўства не апынулася пад кантролем ангельскага флёту».

У апошні час прыхільнікі павялічэньня флёту Амэрыкі разгортваюць моцную прапаганду за ўсім краі. Пры гэтым некаторыя выступаюць з анты-ангельскімі прамовамі.

Аргентынцы выганяюць Гувэра з краю.

УРАД АДКАЗВАЕ РЭПРЭСІЯМІ ПРОЦІ ДЭМАНСТРАНТАЎ.

НЬЮ-ЁРК, 15-XII. Водгук паведамленьню «Асошыэйтэд Прэс», у часе прыезду Гувэра ў Буэнос-Айрас адбылася дэманстрацыя спачуваньня праваднуру нікараґуанскіх паўстанкаў Сандзіно, які вядзе барацьбу проці амэрыканскай інтэрвэнцыі. Была выклікана паліцыя, якая пачала на дэманстрантаў. Некалькі чалавек паранены, 4 арыштаваны.

«Асошыэйтэд Прэс» паведамляе, што ў выніку нібы выкрытае змовы на жыцьцё Гувэра, у Арґентыне арыштавана 50 падазроных асоб. «Юніанс Пост» паведамляе, што агульна ўсе арыштаваных за час побыту Гувэра ў Арґентыне дасягае да 1000 чалавек. Будынак місіі Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, куды заехаў Гувэр, ахоўваецца ўзмоцненым парадам салдат.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1-ай гадз. ночы).

Становішча ў Аўганістане зьмянілася к горшаму.

ЛЁНДАН, 17-XII. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Нью-Дэлі (Індыя): «Становішча ў Аўганістане на працягу апошніх 2-х дзён рэзка зьмянілася к горшаму. Як паведамляюць, бойкі між урадавымі войскам і паўстанцамі адбываюцца як наўкол Кабулу, так і наўкол Джэлал-Абаду.

Паўстанцы мелі некаторы посьпех у раёне Кабулу: яны захапілі два фарты, зброю і амуніцыю, якая там знаходзілася.

У Джэлал-Абада паўстаўшыя пляменьні перарвалі перамовы з прадстаўнікамі ўраду і аднавілі варожыя дзеяньні.

Па вестках з аўганскай граніцы, падышах Аманула і яго жонка схаваліся ў форце, бо армія выступіла супроць іх. Між Кабудам і Індыяй няма паштовых зносін ужо на працягу месяца.

* * *

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 18-XII. У газэце «Мілієт» зьмешчан артыкул наконт падзей у Аўганістане. У артыкуле між іншым зазначана: «Не зважаючы на завярэньні хаусьлівых тэлеграм з пяцёўных крыніц, рэакцыя ў Аўганістане перапіць паражэньне. Вялікі прэстыж Турцыі вяўляецца прыкладам для братэрскага Аўганістану і іншых краёў Усходу. Моладзь іншых народаў навучаецца на нашым вопыце. Правадыр дзяржавы, які змагаецца за вынішчэньне абсалютызму, выклікае захапленьне».

Новы ангельскі сталены трэст.

ЛЁНДАН, 17-XII. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «Заснавана новае таварыства «ангельская сталёвая карпарацыя», якая набывае некаторыя поўныя гатункі маемасьці сталёвых і машынабудаўнічых фірм Вікерс, Вікерс-Аўстрэлс і Камэль-Лерд».

РУРСКІЯ ГАРНЯКІ ІДУЦЬ З КАМПАРТЫЯЙ.

БЭРЛІН, 18-XII. На выбарах у праўленьне мясцовае арганізацыі саюзу гарнякоў у Барбэку (ля Эсэну) пераважаючую большасьцю галасоў абраны кандыдаты левае прафсаюзнае меншасьці.

У рабочых колах лічаць, што вынікі выбараў у Барбэку зьяўляюцца непасрэдным вынікам нядаўнага канфлікту ў Рурскай прамысловасьці, які выкрыў здрадніцкую ролю сацыял-дэмакратаў.

ГАЛАДОЎКА ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ У РЫЗЕ

РЫГА, 18-XII. Газэты паведамляюць, што вязьні рыскага цэнтральнага астрогу абвясьцілі галадоўку ў знак протэсту проці адхіленьня сойміам законапраекту рабоча-сялянскае фракцыі аб амністыі.

ГАЛАДУЕ БОЛЬШ 100 ЧАЛАВЕК.

РЫГА, 18-XII. Галадоўка палітычных зьняволеных адбываецца ўжо чацьверты дзень; галадуючыя патрабуюць амністыі палітычным, скасаваньня царскіх законаў і ваенна-палявых судоў. Як паведамляюць газэты, у рыскіх астрогах галадуе ўсяго 101 чалавек.

РАБОЧЫЯ СХОДЫ ЗАБАРОНЕНЫ.

РЫГА, 17-XII. Міністр унутраных спраў забараніў усе сходы левых рабочых, назначаныя на 16 18 сьнежня; у гэтыя дні ў сойме будзе абмяркоўвацца законапраэкт аб амністыі, пададзены рабоча-сялянскай фракцыяй.

Прыезд італьянскіх дыплёматаў у Ангору.

АНГОРА, 18-XII. Анатолійскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што ў Ангору прыехаў нам. міністра замежных спраў Італіі Грандзі в жонкаю і разам з італьянскім паслом у Турцыі.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

ПОЛЬСКАЯ ПРЭСА АБ ВЫСТУПЛЕНЬНІ ШТРЭЗЭМАНА.

ВАРШАВА, 18-XII. Вострая дыскусія між Штрэзэманам і Залескім на сесіі рады Лігі Нацый у зьвязку са скаргамі нямецкае меншасьці Верхняе Сілезіі на адносіны да яе польскае ўлады выклікала жвавыя тлумачэньні ў польскім друку і палітычных колах. Зазначаючы на нервовы і незвычайна востры тон прамовы Штрэзэмана, польскія газэты пішуць, што гэта не вынікнецца выпадковасьцю, але сьведчыць аб жаданьні паставіць на чаргу дня пытаньне аб Верхняй Сілезіі.

Чаму зьезд не адбыўся?

«Бел. Крыніца» (№ 57) паведамляе, быццам зьезд „Т-ва Бел. Школы" не адбыўся таму, што „часова паўнамоцная камісія" т-ва, якая складаецца з так званых „сенатараў", зумысьля завозна адклала закаў аб дазволе, каб яго не атрымаць.

Чыгуначная катастрофа.

Між станцыямі Вялюнь—Понтнуў Пязанскай дырэкцыі здарылася сьляпая чыгуначная катастрофа. Стаўкнуліся два таварныя поезды, пры гэтым абодва цягнікі і 44 таварныя вагоны разьбіліся ўшчэнт. Перарыў у руху трываў 18 гадзін. Чатыры асобы забіты, шэсьць цяжка паранены. Страты ад катастрофы раўнаюцца 2 мін. злотых.

Адозва БХД.

ЦК Беларускай Хрысьціянскай Дэмакрат і надрукаваў у сваім органе «Беларуская крыніца» адозву да „беларусаў—каталікоў", у якой называе забарону віленскага Лябшкоўскага належнаю да БХД „новай начуцкай правай ангелскага польскага шавінізму" і «служэньнем польскай палітыцы праз насьцяж».

У Саюзе ССР.

Турксіб пракладзен на 335 клм.

Тав. Рыкаў віншуе будаўнікоў чыгункі з перамогаю.

МАСКВА, 19-XII. Тав. Рыкаў атрымаў наступную тэлеграму: „Рэйкі паўночнае часткі Туркестана Сібірскае чыгункі пракладзены на 335 кілямэтраў да станцыі Ангуз. Заданьне ўраду выканана, пераможаны ўсе цяжкасьці будаўніцтва. Агульны сход рабочых будаўнікоў, якія зышліся адзначыць здабытую перамогу на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, вітае вас з гэтаю перамогаю; просім вас перадаць нашаму Рабоча-Сялянскаму ўраду, што і ў далейшым яго заданьні будуць выконваца. Няхай жыве гаспадарчая магутнасьць нашага Саюзу».

Станцыя Ангуз. Прэзыдыум сходу.

У адказе т. Рыкава рабочым таварыцца.

«Дзякую за прывітаньне. Перадайце рабочым і тэхнічнаму персаналу маё гарачае прывітаньне. Я ўпэўнен, што пабудова гэтае чыгункі, якая мае вялізнае значэньне для ўмацаваньня гаспадарчае магутнасьці Саюзу Саветаў, будзе сілами рабочых, інжынэраў і тэхнікаў даведзена да канца ў вызначаны час».

ПАЧАЎСЯ СУД НАД ЛУДАРВАЙЦАМІ.

СЯЛЯНСТВА ПАТРАБУЕ СУРОВАЕ КАРЫ КУЛАКАМ-ГВАЛТАЎНІКАМ.

ІЖАЎСК. Сёньня ў абласным судзе Воцкае аўтаномнае вобласьці распачалося судовае даследаньне на лударвайскай справе аб масавай лупцоўцы кулакамі сялян-беднякоў і сераднякоў у вёсках Лударвай, Юські, Людзя, Непрамненая Іжаўскага павету. Было ацлупцавана больш 300 сялян.

Лударвайская справа прыцягнула да сябе ўвагу ўсяе воцкае грамадзкасьці. Вопкі клюб, дзе слухаюць працес, перапоўнен сялянамі і вацякамі. З вёсак прыехала шмат прадстаўнікоў сялянства для ўдзелу ў працэсе.

«Ижевская Правда» і іншыя мясцовыя газэты вымушчаюць сёньня дзесяткі рэзалюцый сходаў сялянства, якія патрабуюць сурова пакараць кастральшчыкаў лупцоўкі.

Апроч дзяржаўнага пракурора абвінавачваюць і прадстаўнікі мясцовага друку, «Бедноты» і цэнтральнае «Крестьянской Газеты». Старшынствуе старшыня абласнога суду Васіляеў. Заседачы—баспартыйцы сяляніна Мултанскае вобласьці Бязьдзелаў і рабочы Іжаўскага заводу Абдасаў.

* * *

ІЖАЎСК, 18-XII. Гэтымі днямі ад быўся агульны сход гр-н Лударвая. Абмяркоўвалася пытаньне пакоя апошніх вылазак мясцовых кулакоў, якія сабралі подпісы пад заявай, каб зьмяшчыць кару арганізатарам лупцоўкі. Устаноўлена, што заява падроблена кулакамі, подпісы «за нянісьменных» сялян фальшывыя. На сходзе ўхвалена прасіць пралетарскі суд сурова пакараць арганізатараў лупцоўкі.

Рабочыя не сьвяткуюць каляд.

ХАРКАЎ, 18-XII. З Адэсы, Днепрапятроўску і іншых гарадоў надыходзяць весткі, што рабочыя шмат-якіх прадпрыемстваў ухваляюць пастановы працаваць у калядныя дні.

* * *

СІМІФЕРАПАЛЬ, 19-XII. Рабочыя друкарняў ухвалілі працаваць на каляды і заклікаюць пайсьці на іх прыкладзе рабочых гарбарняў, дзяржаўных млынаў і электрастанцыі.

* * *

ІЖАЎСК, 19-XII. Рабочыя большасьці цэхаў іжаўскіх заводаў адмаўляцца сьвяткаваць каляды. Служачыя шмат-якіх устаноў далучаюцца да пастаноў рабочых.

6-ая партканфэрэнцыя Украінскага Вайсковага Вокругу.

ХАРКАЎ 19-XII. Адчынілася 6-е акруговая партыйная канфэрэнцыя Украінскага Вайсковага Вокругу. На канфэрэнцыю прыехала блізка 300 дэлегатаў з правам рашаючага голасу. Канфэрэнцыя абрала гарнаровы прэзыдыум у складзе палітбюро ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)У і паслала прывітальную тэлеграму ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)У, Рэвалюцыйнаму Вайсковаму Савету СССР, палітычнаму кіраўніцтву Рабоча-Сялянскай Чырвонае арміі, выканкому Камінтэрну і Усесаюзнаму зьезду прафсаюзаў. Для ўдзелу ў працы канфэрэнцыі прыехаў т. Бубноў.

Рабочыя Ленінграду на перавыбары ў вёску.

ЛЕНІНГРАД, 19-XII. Таварыства шэфства Выбарскага раёну пасылае ў Вялікалуцкую акругу ў розныя падшэфныя раёны групы рабочых 13-ві заводаў для ўдзелу ў падрыхтоўчай кампаніі да выбараў у саветы. Рабочыя заводу Імя Карла Маркса пасылаюць сваім падшэфным пажарную машыну з запаснымі часткамі і камплектам агнятрывалае вопраткі. Рабочыя металюргічнага заводу пасылаі вялікі 3-ядзінавы радыёпрыёмнік. Рабочыя заводу «Светлана» дадуць падшэфным вёскам трактары. Апроч таго, у падшэфных раёнах будзе заснавана 11 машынных і мэліярацыйных таварыстваў

Ледзяныя заторы ля Ленінграду.

ЛЕНІНГРАД, 18-XII. Ладаскі лёд, да сягнуўшы Нявы, стварыў буйныя заторы, ад якіх узьнялася вада. У некаторых мясцох уздым вады пагражае заводам. Сапёрныя каманды, пачынаючы ад учарайшага дню, увесь сёньняшні дзень узрывалі затор. За сёньняшні дзень учынена 11 выбухаў у раёне мосту злучаючае вёскі Фінляндскае чыгункі.

З прычыны ўздыму вады Усць-славянскі лесапільны заход скарацў свае працу напалову; рэшта заводаў працуе пакуль-што з поўнаю нагрузкаю.

КУЛАК У СІБІРЫ БІТЫ.

ХАБАРОЎСК, 17-12. Водгук першых весткаў аб выніках перавыбараў у краі, у сельсаветы ў пераважная большасьці праходзець бодкіні і сераднякі. Не зважаючы на актыўнасьць кулакоў, нагадзаецца павялічэньне ў складзе саветаў процанту партыйцаў і камсамольцаў. Прысутнасьць на выбарчых сходах значна вышэйшая за справаздачную. Сярэдні процант явкі—40—55 проц.

Гэты ўзровень набліжаецца да ўзроўню леташняе кампаніі.

УСЕУКРАІНСКІЯ КУРСЫ АНТЫРЭЛІГІЙНЫХ КІРАЎНІКОЎ.

ХАРКАЎ, 17-12. У апошні час розныя рэлігійныя і сэктанскія групы разгарнулі ўзмоцненую дзейнасьць на Данбасе. У зьвязку з гэтым усеукраінскі зьезд саюзу горнарабочых прыняў патрэбным заснаваць спэцыяльныя кваліфікацыйныя ўсеукраінскія курсы для падрыхтоўкі кіраўнікоў пачатковых гурткоў антырэлігійнае прапаганды.

МОЛАДЗЬ ВЯДЗЕ ДАРОСЛЫХ РАБОЧЫХ.

ПЕРМ, 19-XII. На заводзе „Сэкратар" праца ўдарных брыгад моладзі дала павялічэньне прадукцыйнасьці працы на 200 проц., а таксама скарачэньне браку на віне рабочых. У сярэдніх кожны з ударнікаў выпрацоўвае 55 штук дэталяў за дзень замест 35-ці, якія выпрацоўвае дарослы рабочы. Даросл

Ленінскім шляхам да сацыялізму.

Пралетарскае прывітаньне 7-й Менскай акруговай партканфэрэнцыі

Узмацнім палітвыхаваўньне шырокіх мас на аснове пастаноў XV зьезду і лістападаўскіх пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Шырокім разгортваньнем самакрытыкі яшчэ больш узьнімем актыўнасьць рабочае клясы і сялянства ў пабудове сацыялізму.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ АДЗІНСТВА.

НА VII МЕНСКАЙ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ 19-ГА СЬНЕЖНЯ Г. Г.

Ужо другі дзень як увага пралетарскіх мас гор. Менску і акругі прыкавана да работ Менскай партыйнай канфэрэнцыі. Работа апошняй мае шырокі водгук сярод рабочых, батракоў і чырвонаармейцаў усяе Меншчыны.

Учора вечарам выступалі чыгуначнікі, рабочыя завод „Энэргія", рабочыя заводу „Камунар". З маленечкай майстэрні, дзе знаходзілася толькі 60 чалавек, ды зараз вырасьлі ў завод, дзе працуе ўжо 400 рабочых - апавядае т. Мартінкевіч з „Энэргіі", ды перамаглі разбурэньне, ды ня сухімі лічбамі, а фактамі даводзілі аб нашым росьце.

Рабочы хлебазаводу т. Паўкалас заяўляе, што яны пераходзяць у незабаве на 7-мігадзінны рабочы дзень і запрашае дэлегатаў канфэрэнцыі ўпэўніцца ў росьце заводу—прыйсьці да іх на прадпрыёмства.

Сёньня (на ранішнім пасяджэньні) на [illegible] канфэрэнцыі вясковы батрак т. Міцько, які сказвае: толькі камуністычная партыя адкрыла батраку шлях лепшай долі.

Пастух т. Ідзе, перадаючы ў прэзыдыум свайго вырабу трубу, кажа: — на гук трубы гатовы стаць на барыкады ў абарону пралетарскай рэвалюцыі, а пу ай (перадае ў прэзыдыум пугу) прагоніце ўсіх бюракратаў, расстратчыкаў і ўсіх іншых, хто перашкаджае нашаму будаўніцтву. Упэўненым «добра» адказалі дэлегаты на заклік т. Сянкевіча, што батракі павінны заняць першую пазіцыю ў контр-атацы на кулака.

На вячэрнім пасяджэньні зноў устаюць усе прысутныя ў залі, зноў аплёдыруюць уваходзячым рабочым і чырвонаармейскім калёнам. На трыбуне рабочы першай друкарні т. Яноўскі, на трыбуне чырвонаармеец т. Русін. Справа падняцьця вытворчасьці, справа абароны краіны—вось на чым застанаўляюць увагу канфэрэнцыі дэлегаты.

— Штыкі байцоў нашай дывізіі першымі заблішчаць у паветры, калі трэба будзе адбіць тыя рукі, якія нам спрабуюць перашкодзіць будаваць сацыялізм.

Далей выступаюць прадстаўнікі ад рабочых «Меншвея», ад тэкстыльнай фабрыкі, ад работніц дэлегатак, ад заводу «Дрэваапрацоўнік».

—Новы лёкамабіль, 50 новых станкоў—вось нашы дасягненьні,—кажа тав. Вілько.

Канфэрэнцыю таксама вітала беларускае, польскае і яўрэйскае настаўніцтва і навуковыя працаўнікі. Усе заявралі аб сваёй аддаванасьці партыі, аб сваім адзінстве з ёй.

Чым небясьпечны правы ўхіл?

Правы ўхіл уяўляе сабой дробна-буржуазную няўстойлівасьць асобных праслоек партыі, іх нездольнасьць да ўпартай і вытрыманай барацьбы з капіталістычнымі элемэнтамі.

Правы ўхіл зьяўляецца ўступкаю асобных праслоек партыі ваціску новага капіталізму, кулаку і нэпману. Пагэтаму правых ухілістаў можна хутчэй усяго сустрэць у тых савецкіх, партыйных і гаспадарчых арганізацыях, якія сутыкаюцца з капіталістычнымі элемэнтамі і даюць адпор іх націску.

Барацьба такая цяжкая, а капіталісты такія лоўкія і настойлівыя, што ў асобных працаўнікоў пачала апарату зьяўляецца жаданьне зьмягчыць яе, шляхам уступак капіталістычным элемэнтам. Ня мала было выяўлена правых ухілістаў у часе мінулай хлебазагатоўчай кампаніі ў нізавых савецкіх, партыйных і кааперацыйных арганізацыях. Б[illegible], ёсьць правыя элемэнты ў паветах, губэрскіх арганізацыях і нават, часткова, у нашых цэнтральных апаратах.

Мы жывём у краіне дробнабуржуазнай, абкружанай з усіх бакоў капіталістычнымі ворагамі. Нам трэба так будаваць сваю гаспадарку, каб быць больш моцнымі ў момант рашучай сутычкі з сусьветным капіталам. Для гэтага партыя праводзіць індустрыялізацыю краіны, вышэйшае прыватны капітал з вытворчасьці і гандлю і цэнтр, праз калгасы і саўгасы пачала ўзводзіць наступ на капіталістычныя элемэнты вёскі.

Але іменна посьпехі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, наступ на капіталістычныя элемэнты выклікаюць злёны адпор кулака і нэпмана. Яны ня толькі ня хочуць без бою здаваць свае пазіцыі, але некаторыя спрабуюць перайсьці ў наступ. За апошні год, апроч вылазкі кулакоў на хлебазагатоўчым фронце, назіраюцца больш частыя выпадкі забойства імі селькораў, старшынь сельсаветаў, а таксама падпалы калгасаў і саўгасаў. Кулак і нэпман хочуць спыніць сацыялістычны наступ пралетарыяту.

Правы ўхіл, адступаючы перад напорам буржуазных патрабаваньняў, гэтым самым палягчае разьвіцьцё капіталізму ў нашай краіне і паслабляе пазіцыі пралетарыяту, перашкаджае сацыялістычнаму наступу. Палітыка яго прыхільнікаў складаецца з таго, што ня трэба наступаць на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі. Яны прапануюць зьменшыць тэмп індустрыялізацыі краіны, не разьвіваць цяжкіх галін прамысловасьці, не будаваць калгасаў і саўгасаў, у вёсцы і зьнізіць падатак для кулацкіх элемэнтаў. Іншымі словамі, правыя прапануюць якраз тое, што выгодна капіталізму і што палягчае яго разьвіцьцё ў нашай краіне. Пры правядзеньні палітыкі правых элемэнтаў было-б немагчыма сацыялістычнае будаўніцтва і, наадварот, былі-б адчынены дзьверы для росту капіталізму. Пагэтаму барацьба з правымі ўхіламі неабходна для таго, каб і далей весьці пасьпяховы наступ на капіталістычныя элемэнты. І ня ў меншай меры патрэбна барацьба з прымірэнцамі, з тымі, хто прыкрывае правы ўхіл, замазвае яго небясьпеку. Немагчыма ніякая барацьба з капіталізмам, калі на практыцы людзі, праводзячыя палітыку партыі, будуць, наперакор ёй, рабіць уступкі кулаку і нэпману.

Гэта ня значыць, зразумела, што мы зусім забываем і пакідаем барацьбу з «левым» ухілам, трацкізмам. Не. Нітроху не паслабляючы барацьбу з трацкізмам, усё-ж цэнтр цяжкасьці трэба перанесьці на барацьбу з правым ухілам, як галоўную небясьпеку ў сучасны момант. Наогул кажучы, і левы і правы ўхілы адналькова кепскія, абодвы яны вядуць да пагібелі дыктатуры пралетарыяту і перамогі капіталістычных элемэнтаў. Але левы, трацкісцкі ўхіл, выяўлен намі і разьбіты дашчэнту. Цяпер кожны рабочы і член партыі ведаюць, што ўяўляе з сябе «левы» трацкізм. Але яшчэ вельмі мала ведаюць аб правым ухіле, які доўгі час жыў, затаіўшыся, і толькі ў апошні час, у сувязі з перажываемымі краінай гаспадарчымі цяжкасьцямі, выпаўз наверх. Таму перамога правага ўхілу, барацьба з ім—ёсьць адна з цэнтральных задач бягучага моманту.

А. Логінаў.

Павысіць якасьць працы сав. партячэек

(ПА МАТАР'ЯЛАХ АБСЬЛЕДВАНЬНЯ ЦКК КП(б)Б).

Галоўнай формай кіраваньня савецкім апаратам і ўдзелу ў працы яго савецкіх ячэек зьяўляецца заслухоўваньне дакладаў на бюро і агульных сходах ячэек. У колькасных адносінах тут усё абстаіць добра, але, ня гледзячы на добрыя агульныя рэзалюцыі, якія выносяцца ў выніку даклаў, якасьць прапрацоўкі гэтых дакладаў вельмі нізкая. Аб гэтым сьведчыць тое, што пры заслухоўваньні дакладаў кіраўнікоў ячэйкі вельмі часта ня ўлічваюць шэрагу цікавых момантаў, якія маюць месца ў дзейнасьці ўстаноў.

Час ад часу заслухоўваюцца даклады на партячэйцы кіраўніка ўстановы; апошні, згодна дырэктыў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б, павінен інфармаваць ячэйку аб розных паасобных мерапрыёмствах, якія намячаюцца ім для правядзеньня ў жыцьцё. Гэткая інфармацыя амаль што адсутнічае. Фармальна на гэта дасцца адказ, што часта кіраўнік ня можа рабіць даклады, што ўсе моманты абгаварваюцца пры агульным яго дакладзе.

Рэзалюцыя ЦК патрабуе своечасовага выкананьня ўсіх пастаноў партячэйкі (раз яны не апратэставаны перад вышэйстаячымі парторганамі). Адказ, у практыцы працы мы маем ня толькі несваечасовае выкананьне, а нават і ігнараваньне пастаноў.

Праўда, у гэтай справе ячэйкі таксама мала праяўляюць ініцыятыву, каб пераносіць гэткія спрэчныя пытаньні ў вышэйстаячыя парторганы. Калі яшчэ прыняць пад увагу, што ў многіх установах кіраўнікі прымацаваны да іншых ячэек і, калі асабліва тыя, праз якіх праходзіць адміністрацыйна-гаспадарчая праца ўстановы, то тут зусім дрэнна—гэткія кіраўнікі адрываюцца ад жыцьця парткалектыву і ня лічаць абавязковым выконваць пастановы ячэйкі, ці ў лепшым выпадку—прапускаюць гэта міма вушэй. Так, нам. Наркамзема, Дырэктар Белсельбанку, Загадчык Касы Ашчаднасьці —знаходзяцца не ў сваіх ячэйках.

Трэба, каб райкомы ЕП(б)Б пераглядзелі ўсе савецкія ячэйкі і абавязкова перамацавалі ўсіх кіраўнікоў да сваіх ячэек.

Цікава адзначыць, што ўхілу савецкіх ячэек у бок адмівіставаньня, умяшацельства ў непасрэдную працу кіраўніка, нідзе не назіраецца. Гэта адзначаецца і ў ранейшым абсьледваньні, а якраз наадварот, што ячэйкі ня досыць ініцыятыўны і самастойны, каб больш «сьмялёй» ажыцьцяўляць свае пастановы. Гэта, магчыма, тлумачыцца тым, што ў савецкіх ячэйках сакратарамі ячэек бываюць супрацоўнікі, падпарадкаваныя ў службовы час кіраўніку і як-бы ні старацца (аб гэтым прапануе і рэзалюцыя ЦК УсеКП(б) адрозьніваць адміністрацыйную працу ад партыйнай, усё-ж такі маецца шэраг магчымасьцяў у кіраўніка так ці інакш узьдзейнічаць на сакратара ячэйкі, дзякуючы чаму не даводзяцца да належнага канца пытаньні (перанясьненьне ў вышэйшыя парторганы).

Асноўнай грамадзкай і масавай работай у савецкай установе зьяўляецца эканомпраца. Калі разгляд экам. камісіі займаліся зусім дробнымі пытаньнямі, ці вельмі агульнымі, то зараз экан. камісіі разглядаюць ня толькі пытаньні зьвязаныя са спрашчэньнем дасяводзтва, але і структуры апарату і найбольш цяжкую галіну працы—паляпшаньне вучоту і справаздачнасьці. Аднак, уся гэтая праца абмяжоўваецца экан. кам. На экаком. нарады выносяцца вельмі рэдка і гэткія мала калі склікаюцца. Усё яшчэ назіраецца арганізацыйная путаніца, калі не адрозьніваюць, што экан. кам. ёсьць падрыхтоўчы орган, што галоўная работа павінна праводзіцца праз экан. нараду, як масавую форму, куды могуць быць удзяжуты ўсе супрацоўнікі.

Апошняя адозва ЦК УсеКП(б) і шэраг дырэктыў па прафсаюзнай галіне аб ажыўленьні крытыкі недахопаў нашай работы садзейнічалі таму, што служачыя больш сьмела і рашуча пачалі выяўляць паасобныя факты. Аднак, выяўленьне гэта праходзіць пакуль што ў скрытых формах, з боязьню.

На агульных сходах служачых пытаньні аб барацьбе з бюракратызмам, валакітай і падхалімствам спэцыяльна не стаялі. Дырэктывы па прафсаюзнай лініі—дырэктыўнае пісьмо УсеЦСПС і ЦК Саюзу Саўгасрабсьлужачых, якія гавораць аб барацьбе з розным недахопамі ў савецкім апараце, аб ажыўленьні дзейнасьці праф. ячэек—і то ня ставілася ўсюды на агульных сходах. З 27 устаноў, па якіх магчыма было падлічыць, была прапрацоўка гэтых лістоў на агульных сходах у 16 выпадках, на прафактыве толькі—9 выпадкаў і ў 7 калектывах гэта не прапрацоўвалася.

Выяўленьне канкрэтных фактаў і выпадкаў безгаспадарчасьці, бюракратызму, пратэкцыянізму мясцовымі парт. і праф. арганізацыямі займае вельмі малое месца. Усё яшчэ абмяжоўваюцца, галоўным чынам, выясьненьнем рэзалюцый «заклікаючых без боязьні і ня гледзячы на асобы» весьці барацьбу з бюракратызмам. На пытаньне мясцовым, „якія выяўлены канкрэтныя факты бюракратызму", амаль што нічога няма. Калі і былі якія-небудзь факты, то вельмі дробныя. Абгаварвалі аб бюракратызьне касіра, дзеловода, бухгальтара,—на большае не рашаюцца.

Партячэйкі па сваёй ініцыятыве амаль зусім ня выявілі канкрэтных фактаў. Усе факты, якія абгаварваліся на ячэйках, сталі „достояннем гласности" у выніку пабочнага выяўленьня іх (праз друк, падача заяў у кантрольныя органы і г. д.), і заўсёды пры абгаварэньні іх высьвятляецца, што многія ведалі аб гэтых фактах, але ня было рашучасьці адкрыта паставіць іх на абгаварэньне ў парт'ячэйцы. Прычым назіраецца адно цікавае зьявішча, што рашучасьць і выкрыцьцё фактаў праяўляюцца тады, калі кіраўнік, ці іншая «важная асоба» куды-небудзь выяжджае, здымаецца ці перакідваецца на іншую работу.

Насьценгазэты ў апошні час, у зьвязку з правядзеньнем лёзунгу самакрытыкі, некалькі ажывілі зьвест артыкулаў у насьценгазэтах, больш рашуча сталі выяўляць недахопы сваёй установы, аднак, назіраецца, што з боку адміністрацыі мы маем дрэнныя адносіны да насьцегазэт. Па закранутых пытаньнях і заметках у насьцегазэце рэдка хто адказваў. Нават больш таго. Ёсьць выпадкі варожых адносін да насьцегазэты.

Вельмі мала ўдзяляецца ўвагі высьвятленьню паасобных фактаў бюракратызму, валакіты і г. д.

Заметкі агульнага друку, якія паказваюць на тыл ці іншыя недахопы ўстановы, ячэйкамі разглядаюцца, але пасьля прысылкі іх з органаў ЦКК РСІ.

Усе гэтыя недахопы пастановамі ЦК і ЦКК КП(б)Б па рабоце савецкіх ячэек на падставе абсьледваньня іх прапанавана зьліквідаваць і паглыбіць работу ў напрамку больш рашучай барацьбы з бюракратызмам на ўмовах разгортваньня крытыкі і самакрытыкі недахопаў нашай работы.

П. П—ч.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Зьбіраем жалезны лом.

(Капыльскі раён, Меншчына).

У зьвязку з тыднем лому, усе камсамольскія арганізацыі нашага раёну распачалі гэтую справу. Так, напр. некаторыя больш актыўныя ячэйкі растлумачваюць насельніцтву аб задачы жалезнага лому і аб карысьці, якая ад гэтага будзе дзяржаве.

Апроч гэтага камсамольцы самі зьбіраюць у сялян жалезны лом, робячы абходы па ваколічных вёсках.

Тыя сяляне, якія больш бліжэй жывуць да сельска-гаспадарчага таварыства, самі дастаўляюць у местачковую капыльскую кааперацыю лом.

За першыя дні Капыльскае сельска-гаспадарчае таварыства загатовіла больш чымся 40 вазоў жалезнага лому. Трэба спадзявацца, што кожны кавалак сапсаванага жалеза будзе здадзен на карысьць дзяржаве.

М. Зясковы.

Пераўпарадкаваньне мястэчка Капаткевічы.

Сёлета праароблена вялікая праца па пераўпарадкаваньні мястэчка Капаткевічы. Праведзен даклады вучог местачковага і сельскага насельніцтва, вылучена папуўзнік ад мястэчка самаўрадаваньня і ўжываюцца захады да надзяленьня зямлёю беззямельнага насельніцтва.

У метах узьвяцьця матар'яльнага дабрабыту насельніцтва мястэчка саматужна-прамысловы саюз арганізаваў цалы шэраг вытворчых арцеляў, у якія ўцягнута 130 сем'яў.

Выдадзены крэдыты па лініі саматужна-прамысловага саюзу і па дзяржбюджэту ў суме 14.000 руб., па лініі сельскае гаспадаркі—20.000 руб. і мясцоваму бюджэту 5000.

У мястэчку пабудавана некалькі дамоў для арцеляў, пабудавана памяшканьне для яўрэйскае школы, абсталёван смалакураны завод.

Неабходна адзначыць, што да гэтага часу ня выкананае заданьне па арганізацыі ў мястэчку арцелі па выпрацоўцы чарапіцы.

Несваечасова выдзяляецца зэмфонд для надзелу зямлёю беззямельных дваро̆ў. Арганізаваныя вытворчыя арцелі нездавальняюча забясьпечаны інвэнтаро̆м і сыравінаю. Адзначаецца слабы ўдзел аграномӑў у зьвяўпарадкаваньні мястэчка. Атрыманы саматужна-прамысловым саюзам па мясцовым бюджэту крэдыт у 5000 руб для кааперавання бядняцкага насельніцтва выкарыстан, як процантная пазыка ў вяротным капітале шавецкае арцелі.

Даклад аб працы па ўпарадкаваньні м. Капаткевічы заслухан нядаўна на насяльжэньні прэзыдыуму Акрвыканкому. Акрвыканком даў шэраг зазначэньняў аб вынічэньні маючыхся недахопаў і прапанаваў ужыць захады да хутчэйшага канца працы на зямляўпарадкаваньню мястачка.

Пастаноўлена таксама арганізаваць у мястэчку чарапічна-бетонную майстэрню.

М. Гохфэльд.

Мазырчына.

„Дудка Беларуская".

У руніэвіскім аддзеле Аршанскага акруговага краязнаўчага музэю знойдзен зборнік вершаў на польскай, расейскай і бе арускай мовах пад агульнай назвай «Dudka Białruskaia». Зборнік напісан у м. Паставы і Палленполь, 6. Валежнага павету. Значатку гэтага зборніка ідуць вершы Ф. Багушэвіча з «Дудкі Беларускай». У парэдуньні з выданьнем «Дудкі» Дзяржыдаваецтвам ёсьць лішні верш («Niemec») «Niemiec». Заканчваецца зборнік артыкулам «Стосунак рухоў машых до справы ўласьцівскай». Узьнікае пытаньне, наколькі Багушэвіч сам прымаў удзел у паўстаньні 1863 году, якое разьбіваецца аб неспачуваньне сялянства паўстанцам, то ці не зьяўляецца гэты артыкул працай Ф. Багушэвіча.

Кніга накіроўваецца ў Бел. Акадэмію Навук для апробацыі.

Д. ВАСІЛЕЎСКІ.

Рыхтуемся да сьвяткаваньня 10-годзьдзя агалашэньня БССР.

Пад знакам дасягненьняў.

Вёска дзейна рыхтуецца да сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя БССР.

У Койданаўскім раёне шырока разгарнулася праца па падрыхтоўцы да сьвяткаваньня. Па ўсіх сельсаветах арганізаваны камісіі ў складзе прадстаўнікоў грамадзкіх арганізацый, сельсаветаў, партыйных і камсамольскіх ячэек. Камісіі гэтыя ўжо апрацавалі пляны правядзеньня сьвяткаваньня.

Пры ўсіх хатах-чытальнях, а дзе іх няма пры сельсаветах будуць арганізаваны выстаўкі дасягненьняў за 10 год. Усе, як гаспадарчыя, так і культурныя арганізацыі і ўстановы дзейна рыхтуюцца да выставак і складаюць дыяграмы, падбіраюць матар'ялы і г. д. Рыхтуюцца спэцыяльныя нумары насьценных газэт, прысьвечаныя сьвяту, у якіх будуць высьветлены дасягненьні ў галіне культурнага і гаспадарчага будаўніцтва.

Асабліва жывая падрыхтоўка ідзе па школах. У школах самігодах і школах сялянскае моладзі ў сьвята будуць праведзены гутаркі аб нацыянальнай палітыцы савецкае ўлады і аб дасягненьнях у галіне нацыянальнае палітыкі і культурнага будаўніцтва. У дзень сьвята па ўсіх школах будуць праведзены ранішнікі.

Ва ўсіх самігодках райёну вызначаецца па адной стыпендыі імя абвешчаньня БССР для бяднейшых дзяцей і партызан-барацьбітоў за вызваленьне БССР.

У раённым цэнтры ў Койданаве ў дзень сьвята адбудзецца масавы мітынг прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый, вайсковых часьцей і сялян бліжэйшых вёсак. У гэты-ж дзень адбудзецца ўрачыстая закладка аграпуп'ту і адчыненьне помніка на бацькіх могілках.

На вёсны напярэдадні сьвята адбудуцца ўрачыстыя сходы сялян з даладамі аб дасягненьнях за 10 год і успамінамі аб барацьбе за вызваленьне БССР.

Гэты-ж дзень койданаўская вёска адзначыць шэрагам перадоў на гаспадарчым і культурным фронце.

У в. Невтінках адчыняецца польская хата-чытальня.

Вёска Дзячыль урачыста адчыняе цагельню.

Вёска Бароўцы пускае ў ход смаланурна-шпігінарчы завод.

У Крыславе і Банінаве закладаюцца сельска-гаспадарчыя арцелі—яўрэйская і беларуская.

Перамога на культурным фронце, перамога на гаспадарчым фронце,—так адзначыць беларуская вёска дзень 10-цігодзьдзя БССР.

Л. С.

Койданава.

Адчыняем новыя лекавыя ўстановы.

Віцебск, 19-XII. Да 10-цігодзьдзя БССР на Віцешчыне будзе адчынен шэраг лекавых устаноў.

На сродкі спажывецкай кааперацыі у Межэнскім раёне адчыняецца дзіцячая кансультацыя. Дзіцячыя ясьлі арганізоўваюцца пры савецкай гаспадарцы «Адаменкі» (Лёзьненскі раён) і камуне „Чырвоны Сьцяг" (Гарадоцкі раён).

У Высачанскім, Сенненскім, Бешанковіцкім і Гарадочкім раёнах будуць адчынены кансультацыі для цяжарных. У самым Віцебску адчыняецца дыспансэр па вылучэньню прафэсыянальных захворваньняў.

Падрыхтоўкі няма.

(Рагачэўск раён, Бабруйшчына).

Калі дзе-ні-дзе праводзіцца якая небудзь падрыхтоўка да 10-годзьдзя агалашэньня БССР, дык у нашым раёне ні гуку на чуваць аб гэтым сьвяце. Яшчэ дагэтуль не складзена камісія па правядзеньню сьвяткаваньня агалашэньня Беларусі, а аб сельсаветах і гаварыць няма чаго, там няма ніякай падрыхтоўкі.

А між тым справа падрыхтоўкі павінна быць наладжана добра, бо сьвяткаваньне 10-годзьдзя БССР гэта вялікае сьвята, але дзякуючы адсутнасьці падрыхтоўкі сьвята на будзе мець шырокага размаху народнага сьвяткаваньня вызваленьня ад капіталізму і нацыянальнага ўціску, якое было 10 год таму назад.

Я. Крушына.

На фронце загатовак.

ПЛЯН ЗАГАТОВАК ВЫКАНАНЫ.

Гомель, 19-XII. У апошні час тэмп хлебазагатовак аслабеў. Асабліва незадавальняюча праходзіць загатоўка асноўнай культуры жыта. Загатоўлена пераважная большасьць яравых культур. На зьмяншэньне загатовак некаторы ўплыў зрабіла скарачэньне сялянскіх завозаў, у сувязі з бездарожжам. Але асабліва адмоўна адбілася на хлебазагатоўках вельмі недастатковае забясьпечаньне здатнымкаў хлеба—прамтаварамі. Апроч таго, хлебазагатоўчы апарат ня выяўляе належнай актыўнасьці і гнуткасьці, якія патрэбны ў складных умовах бягучай хлебазагатоўчай кампаніі.

Паступленьне памольнага збору таксама зьменшылася. Асноўная прычына—невыкананьне дырэктыў аб правядзеньні масавай праверкі ходу здачы памольнага збору.

Загатоўка ільнянага насеньня паказала далейшае скарачэньне. Вельмі стрыманая рэалізацыя сялянствам ільнянага насеньня выклікаецца адсутнасьцю сланечнікавага алею.

Што датычэ лістападаўскага плану хлебазагатовак, дык ён выкананы з перавышэньнем на 20 проц. Усяго загатоўлена 726 тон хлебапрадуктаў. Плян памольнага збору выкананы ў разьмеры 61 проц. Плян загатовак ільнянага насеньня недавыкананы на 19 проц. Зараз праводзіцца праверка працы загатоўчага апарату.

У ЗАГАТОЎКАХ НАГЛЯДАЕЦЦА ПЕРАЛОМ.

(Жлобінскі раён, Бабруйскай акругі).

Хлебазагатоўка праходзіць быццам нармальна, але-ж дзякуючы слабой загатоўцы некаторых с.-г. і спажывецкай кааперацыі—плян далкам ня выконваецца ў тэрмін, апрача сыравіны, але-ж в боку РВК былі прыняты ўсе належныя захады, каб забясьпечыць ход хлебазагатоўкі, склікаліся часта нарады па гэтаму пытаньню, зроблена аднаму старшыні кааперацыі вымова за нядбайныя адносіны—зараз кожнаму таварыству дадзена кантрольнае заданьне—у сьнежні і студзі зрабіць належны пералом. У некаторых таварыствах выкананьне ідзе добра бо праца пастаўлена, як належыць.

Колькі-ж выканана заданьня. Лічбы паказваюць наступныя вынікі: па хлебазагатоўцы дадзена заданьне на райён 308.800 клг., выканана 28.242 клг. ці 9 проц., а трэба было выканаць 25 проц.; ільнянага насеньня заданьне 41.600 клг., выканана 35.541 клг. ці 25 проц., а трэба выканаць 30 проц. Памольны збор: дадзена заданьне на 408.000 клг., выканана 97.244 кл. ці 24 проц., трэба было выканаць 40 проц.

У далейшым назіраецца зрух у хлебазагатоўцы.

Андрэй Вірэнскі.

Мітынг-пераклічка ў Гомелі.

Гомель, 14-XII. Мітынг-пераклічка ўскалыхнуў рабочую масу Гомельшчыны. На фабрыцы „Вевэўнай" на мітынгу - пераклічцы прысутнічала больш 1000 чалавек. Рабочыя віталі ініцыятыву рабочых заводу «Пралетарый» і прынялі іх вызаў. Выступаўшыя таварышы заявілі:—лепшым адказам на падкопы нашых ворагаў унутры краіны і за межамі будзе згрупаваньне рабочае клясы вакол партыі—УсеКП(б), правядзеньне ў жыцьцё лёзунгаў індустрыялізацыі краіны ачышчэньне савецтаў ад усяго гнілога бюракратызму і пераніны.

Для выкананьня ўсіх гэтых задач рабочыя даручылі фабрычным арганізацыям намеціць практычныя мерапрыёмствы і прапанавалі наладзіць спаборніцтва паміж цэхамі фабрыкі. Рабочыя фабрыкі „Вевэўнай" паслалі вызаў фабрыцы «Днепр» у Рэчыцы і дэсаноду «Колтруд» у Новабеліцы. Апроч таго, вылучаны дэлегацыі рабочых для актыўнага ўдзелу ў правядзеньні перавыбарчай кампаніі ў падшэфнай вёсцы Пакалюбічах і ў вёсках, дзе жывуць рабочыя з фабрыкі.

Чырвонаармейцы таксама ахвотна адгукнуліся на ініцыятыву рабочых. На мітынгу чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітпрацаўнікоў ухвалена рэзалюцыя наказу чырвонаармейцам, у якой гаворыцца:

— Праз нашы лісты на бацькаўшчыну абяцаем растлумачыць сялянам і аднавяскоўцам задачы, якія стаяць прад перавыбарчай кампаніяй, параім ім прыняць самы актыўны ўдзел у гэтай кампаніі.

Рост мясцовай прамысловасьці.

У Акрыляне разглядаўся вытворчы плян мясцовай прамысловасьці райвыканкомаў на 1928-29 год.

Перад прамысловасьцю пастаўлена задача зьнізіць сабекошт прадукцыі ў параўнаньні з мінулым годам ня менш, чымся на 7 проц. і ў адпаведнасьці з гэтым пераглядзець адпускныя цэны.

Што датычыцца заработнай платы, дык на найбольш адсталых прадпрыёмствах і па найбольш адсталых групах зарплата павінна быць павышана з 2 да 7 проц.

Прызнана неабходным пабудаваць у Пятрыкове вялікую цагельню, для чаго адпускаецца 152.000 руб. Завод павінен ужо ў працягу 1929 году выпусьціць 1.500.000 цаглін. У Лельчыцкім раёне будзе пабудавана смалярня, а таксама зроблена пераабсталяваньне Буда-Сафіеўскага камбінату. Адпускаюцца значныя сродкі (55.000 руб.) на поўную дабудову электрастанцыі ў Тураве.

Пашыраецца электрасетка ў Жыткавічах, там-жа абсталёўваюцца крупарушкі і пярлоўка і будуецца смалярня. Жыткавіцкай электрастанцыі прапанавана зьнізіць плату за карыстаньне электраэнэргіяй бядняцкім і сераднякцкім гаспадаркам да 3 кап. за сьвячу ў месяц.

У Азарычах будуюцца цагельня, чарапічны завод і смалярня.

М. Гохфэльд.

Мазыр.

Хабарнікі падпалілі будынак суду.

Віцебск, 19-XII. У Сураж выяжджалі прадстаўнікі акруговай пракуратуры для высьвятленьня прычын пажару ў Сураскім нарсудзе. Высьветлілася, што будынак суду падпалілі сакратары нарсьледчага і судовага вучастку—Бых і Іспраўнікаў.

Абодвы яны ў працягу 2-х год бралі хабар у гандляроў і канакрадаў з мэтаю дапамагчы ім у часе судовага разбору.

У выніку падпалу згарэлі ўсе справы, якія знаходзіліся ў вучастку. Абодвы яны арыштаваны і сазналіся ў сваіх злачынствах.

ПАСЬЛЯ ДЭКРЭТУ КАРАЛЯ.

(Нявольніцтва ў ангельскіх калёніях).

Каралеўскі дэкрэт 1 студзеня г. г. абвясьціў усяму сьвету: «няма больш нявольніцтва ў вялікай брытанскай імпэрыі». Апошнія прыгоньнікі ў глухім куту Заходняй Афрыкі, у Сьерра-Ліоне, былі вызвалены ў гэты адзначны дзень. Няма больш прыгону ў вялікай культурнай імпэрыі: канчаткова вызвалены прыгоньнікі ў Непале, васальным Гімалайскім княстве, у Келадце (Белуджыстан), а спэцыяльная вайсковая экспэдыцыя к бірмана-кітайскай мяжы зьнішчыла і там нявольніцтва, не было ў поўным росквіце. Усё гэта зроблена «добрым» брытанскім каралём у канцы 1927 году XX веку.

Каралеўскі дэкрэт абвясьціў усяму сьвету, што прыгону больш у імпэрыі няма. Брытанскі прадстаўнік у Лізе Нацый горда глядзіць у вочы сваім калегам, якія так салодка і так многа гаварылі аб вялікіх справах. Праўда, непальскі князёк і келацкі хан зьнішчылі прыгон з зусім іншай прычыны, нічога агульнага ня маючай з «добрым» дэкрэтам «міласьлівага» брытанскага караля. Непаладкі ў справах і спэкуляцыя на чалавечых пачуцьцях—добры спосаб перакачываньня грошай з кішэняў багатых рабаўласьнікаў у сваю ўласную—перавод прыгоньнікаў з прыватнай уласнасьці на ўласнасьць князька і хана за «маленькі» выкуп (і то толькі абяцаны), а адначасова накладаньне на «адпушчаных» прыгоньнікаў такога вялікага падатку, які адпрацоўваць будуць яшчэ іх унукі—вось сапраўдныя прычыны і пабудженьні, якія кіравалі вызваленцамі непальскіх і келацкіх прыгоньнікаў. Вайсковая экспэдыцыя на бірмана-кітайскую мяжу мела, апроч вызваленьня прыгоньнікаў, больш важнае для брытанцаў значэньне: далучыць да брытанскіх абшараў зямлі прыгранічных напалову незалежных племён,—гэта, галоўная мэта, зразумела, выканана ў першую чаргу. Аднак, добрае імя „міласэрднага", «усехрысьціяньнейшага» караля спэкулявала і выйграла.

Сам вялікадушны дэкрэт, які вызваляў з дзесяткі тысяч прыгоньнікаў у Сьерра-Ліоне, быў прадыктаваны, зразумела, ня толькі адзімі «пабуджэньнямі добрай душы»; палітыка пасадзоньняў у гэтай калёніі гумалястыкі патрабавала перамяшчэньня замадаванай за невялікімі плянтацыямі рабочай сілы на новыя буйныя плянтацыі гумалястыкі. Прыгоньнікі толькі зьмянілі гаспадара.

Зусім іншая справа ў Брытанскім Судане, дзе прыгон у поўным росквіце і да сёньняшняга дню, быццам незаўважны і для брытанскага ўраду, на яго-ж уласных і на прыватных плянтацыях. Тут непатрэбна перамяшчэньне рабочай сілы,—выяўляць каралеўскую міласьць не патрабуецца.

Прыгон, сапраўдны, фізычны і юрыдычны прыгон і да сёньняшняга дню існуе ў Судане. Праўда, часта крычаць ангельцы, тыкаючы пальцамі ў вочы Абісініі, дзікай, горнай краіне, з сярэдневяковым укладам жыцьця, з патэрнальным урадам негуса-негесьці („цара-цароў"), што ў гэтай адсталай, адрэзанай зьўрапейцамі-ж ад усяго сьвету, краіне існуе яшчэ прыгон. А кожны раз на такія словы ангельцаў абісінскі негус адказвае: «Паглядзеце на Судан—там прыгон у поўным росквіце». Судан—блізка, Абісінія гэта бачыць. Але Эўропа далёка, яна ня ведае, правільней, ня хоча ведаць аб прыгоне ў Судане.

1928 год XX веку пачаўся „міласьлівым, добрым дэкрэтам". Нявольніцтва скончылася, усе падданыя брытанскага караля—зусім вольныя людзі. Праўда, гэта не датычыцца Судана, і можа яшчэ некаторых краін, але так, прынамсі, гаворыць дэкрэт. Келацкія і непальскія нявольнікі, зьмяніўшыя гаспадара,—ня зусім брытанскія падданыя; толькі іх гаспадары самі—брытанскія падданыя, нявольнікі-ж—непадданыя брытанскага караля.

У многіх брытанскіх калёніях ёсьць яшчэ адзін выгляд рабаўласьніцтва, паўфармальнага, паўюрыдычнага: дзесяткі тысяч „каляровых" нявольнікаў, прывезеных з іншых калёній, пастаўлены ў кабальныя ўмовы. Перадача іх адным гаспадаром другому аплачваецца, як купля нявольнікаў; рабочыя ня могуць пакінуць свайго гаспадара, а на перадачу робіцца натар'яльная здзелка. Такі выгляд прыгону—нярэдкі і зараз у асобных калёніях брытанскай імпэрыі, але, калі ў гэтым выпадку няма фармальнага закону аб рабаўласьніцтве, аб гэтым выпадку, як аб паўюрыдычным, мы гаварыць тут ня будзем.

Не, іншы прыгон існуе ў Судане. Ня зьніштожан ён нават «міласьцівым» дэкрэтам караля, гаварыўшым аб „зьніштажэньні прыгону", але ўспамінаўшым толькі адну калёнію—Сьерра-Ліоне. У Судане прыгон застаецца. Правы рабаўласьніцтва і гандлю нявольнікамі—непарушны. Прыгон ня толькі фактычны, але і юрыдычны.

Не адзін толькі Судан «забыты» каралеўскім дэкрэтам. У канцы 1928 г. амаль праз год пасьля дэкрэту, мы выпадкова даведваемся, што ў Індыі, найбагацейшай і найважнейшай брытанскай калёніі, да гэтага часу існуе ю

НА ФРОНЦЕ КУЛЬТУРНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

СПРАВА ТРОХГАДОВАЙ ВАЛАКІТЫ.

У 1926 годзе дзелавод КАРМЯНСКАГА РВК МАГІЛЕЎСКАЙ АКРУГІ на фальшыванку подпісу атрымаў маю зарплату за жнівень і верасень м-цы ў суме 68 р., як настаўніцы Бычынскай школы.

Я падала заяву ў Кармянскі МК працасьветы, але МК маўчаў. ПРАЗ ГОД я падаю другую заяву і ўрэшце атрымліваю паперку, у якой пытаюцца «ці атрымала я грошы»! Я, вядома, адказала, што не. Паколька, як на валах, Кармянскі РВК перадаў справу ў суд.

У 1928 г. у сакавіку м-цы справу павінен быў разглядаць Магілеўскі акроад, але яе прышлося адкласьці, бо не з'явіўся адказчык, хоць я і „прападаровыла" з Полацкай акругі (Дрыса) да Магілеву.

Урэшце я падала заяву ў ЦП Белпрацасьветы і адтуль атрымала адносіну ад 21-9-28 г. за № 631-06-16, што Магілеўскае акрэраўленьне, не чакаючы прысуду, звярнулася да Кармянскага РВК, каб ён выплаціў мне пэнсію. Але, мабіць, мне прыдзецца здаволіцца адніскай ЦП Белпрацасьветы, бо хутка ўжо тры месяцы як я не атрымала, і тры гадкі як справа пачалася, а пэнсіі ўсё няма!

Я ЗВАРАЧВАЮСЯ З АПЭЛЯЦЫЕЙ ДА САВЕЦКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ І НАЛЕЖНЫХ ОРГАНАЎ: дайце мне магчымасьць атрымаць маю зарплату, а таксама прыцягнеце да адказнасьці тых, хто парушае ведамы законаў аб працы і разводзіць валакіту.

П. ДЗЯТЛАВА.

ШТО ЗРЫВАЕ НАРМАЛЬНУЮ ПРАЦУ ШКОЛЫ.

Калі мы разважаем аб прадукцыі нашых вясковых 4-хгадовых школ і аб якасьці нашых праграм, дык звычайна мы ня ўлічваем бюджэт часу, у які рэалізуюцца нашы праграмы і які ёсьць у распараджэньні нашых вясковых школ.

На процантаў 80 школы распачынаюць свае заняткі з 15 верасьня. К гэтаму часу настаўніцтвам старанна складаюцца навучальныя пляны на час з 15 верасьня па 15 красавіка (два тыдні на падагуленьне), што дае да 170 навучальных дзён. Цяпер паглядзім, калі нашы школы змогуць прыступіць да рэалізацыі гэтых навучальных плянаў і з якім лікам вучняў прыходзіцца гэта распачынаць.

Праўда, на 15 верасьня запішуцца ў большасьці выпадкаў да 75 проц. усіх вучняў, на працягу кастрычніка прыдуць запісацца амаль што ўсе дзеці, якія раней хадзілі у школу. Але як яны наведваюць школу? Як паказаў падлік за лістапад месяц па 9 школах Чавускага раёну (Магілеўшчына), наведваньне школ у сярэднім па месцох наступнае: За верасень-м-ц пропуск навучальных дзён—70 проц., за кастрычнік—42 проц. і за лістапад—25 проц. І гэта пры досыць старанна праведзенай кампаніі сярод бацькоў за своечасовую пасылку дзяцей у школу і за зьнішчэньне пропускаў,—навучальных дзён.

Матывы пропускаў адны:—«бацька ня пусьціў, памагаў у працы» і г. д.

Пры такім становішчы перад настаўніцтвам паўстае пытаньне з якога часу распачынаць рэалізацыю сваіх навучальных плянаў і пры якім ліку вучняў? У лепшым выпадку яны спыняюцца на даце 15 кастрычніка, а гэта зьмяншае лік навучальных дзён да 130-140. Але-ж і гэта дата зьяўляецца ня зусім рэальнай, бо прыход вучняў у школы і вялікі процант пропускаў не дае поўнае магчымасьці стала распачаць заняткі. І калі мы, у лепшым выпадку, будзем мець бюджэт часу ваат у 130-140 навучальных дзён для ўсіх комплексаў, дык гэта зьменшыць нармальны лік часу на 1/3.

Усё гэта робіць немагчымым выкананьне навучальных плянаў і дае сумныя вынікі у сэнсе якасьці прадукцыйнасьці нашых вясковых школ. Настаўніцтва нервуецца, усё ванава і нанава перараз'яркоўвае час для комплексаў і тэмы, стараецца падтягнуць позна зрышоўшых вучняў, адным словам, б'ецца, як рыба аб лёд.

На мойму, трэба ў законадаўчым парадку правесьці, каб пры прыёме дзяцей у школы школьныя рады бралі падпіску ад бацькоў у тым, што яны абавязуюцца своечасова і без пропускаў навучальных дзён пасылаць сваіх дзяцей у школу. Па бяднацкіх дзецях гэта балюча не адаб'ецца.

А. Дабравольскі.

Зьнішчым нацыянальную розьнь.

(Сьмілавічы, Меншчына).

Прыказка «Лепш позна, чым ніколі» часта ўжываецца тым, хто бярэцца за справу са спазьненьнем. Я гэтым не хачу кідаць дакор настаўніцтву Сьмілавіцкіх школ (беларускай, яўрэйскай і польскай) што яно толькі ў лістападзе падумаліся аддаць належную ўвагу інтэрнацыянальнаму выхаваньню.

Дзеці ад бацькоў пераймаюць звычкі нацыянальнай абасобленасьці, маючай падчас адзнакі злоўмыснай розьні. Каб ня быць галаслоўным, я прыведу некалькі выразаў вучняў палякаў і татар па адрасу вучняў беларусоў: «мужычкі бягуць», «мужычкі прышлі».

А беларускія дзеці на гэта рэагіруюць проста: «Давай наступаць на палякаў».

Адносіны паміж беларускімі яўрэйскімі вучнямі нібы лагодныя, а калі прыглядзецца і прыслухацца бліжэй, дык можна пачуць і «жыд» і «мужык».

І «агой» і шмат іншых перажыткаў мінулага.

Настаўніцтва на сваёй нарадзе па пытаньню інтэрнацыянальнага выхаваньня сьцьвердзіла факт нацыянальнай розьні паміж вучнямі беларускай, яўрэйскай школ і што гэтай розьні спрыяла само настаўніцтва сваёй нацыянальнай канкурэнцыяй.

Лічачы гэта шкодным у інтэрнацыянальным выхаваньні, настаўніцтва вызначыла цэлы шэраг мер да зьнішчэньня нацыянальнай розьні: сумоўныя вечары вучняў усіх школ, сумоўныя прагулкі экскурсыйнага характару, аб'яднаньне заняткаў фізвыхі школ беларускай і яўрэйскай. Урэшце і гэта самае галоўнае, настаўніцтва рашыла перанесьці выхаваўчую працу па засьцены школы, на бацькоўскія сходы, на культурныя вечары, дзе ў форме спэцыяльных дакладаў раслумачаць насельніцтву шкодасьць нацыянальнай розьні.

Інс.

Настаўнікі старога гарту.

У Слуцку ў Вострагоўскім прымітыве працуе настаўніца ВАЙНІЛОВІЧ. Яе вучні бацца горш паўка за тое, што яна іх добра дзярэ: б'е лінейкай, ставіць у кут і г. д.

У 2-ой аднагодцы ў II групе працуе настаўніца КАЛЕНЧЫЦ, якая таксама пускае руні ў ход. Напрыклад, у пачатку настрычніка яна вучню Тэмчыну (яўрэй) размалявала алоўкам лоб пражыкамі, вучню Жылка размалявала твар крэйдай.

У 1 аднагодцы ў II групе працуе настаўніца ЛЕГАЧЫНСКІ, які мае любімчыкаў, але вучняў словамі «дурак», «дура», «хуліганьё» і г. д.

Інспэктар Нар. Асьветы, зьвярні ўвагу на слуцкія школы.

СЛУЦАК. Г. БОГУШАЎ.

Наладзілі гарачыя сьнеданьні.

(Круціцкі сельсавет, Самахвалавіцкага р., Меншчына).

Раён, які абслугоўвае Дубінка-Слабодская школа, досыць вялікі. З чатырох насельных пунктаў (усяго 8) хадзіць дзецям прыходзіцца за 2 і 3 кілёмэтры. Наведваньне школы было вельмі слабое, а аблізі ў зімовыя сьнягі, калі ў школе зьмірала вада. Як ні спальвалася школа, усёроўна ў ёй было вельмі сьцюдзёна, бо будынак патрабаваў вялікага рамонту. Частка рамонту была зроблена ў мінулым годзе за сродкі РВК, а частка сёлета за сродкі самаабкладваньня.

Пры рамонце сельсавет, раённспэктар і загадчык школы зьвярнулі ўвагу на арганізацыю пры школе гарачых сьнеданьняў. Да адной з печак пры перакладцы не дарабілі пліту з кагломі, дзе можна варыць страву, альбо нагрэць вады для гарбаты. З'раз гарачыя сьнеданьні ўжо наладжаны. Дзеці атрымліваюць кубак салодкае гарачае гарбаты. Частку пасулы прынесьлі дзеці, а частку набілі. На цукор і гарбату грошы прынесьлі дзеці, якіх бацькі даюць аказтна. Сялянства вельмі задаволена, што дзеці «хоць пагрэюць путроб». З увядзеньнем гарачых сьнеданьняў паляпшылася і наведваньне вучнямі школы.

А. Р.

З гарачкі—прастуда.

У Ветрынскім раённе яшчэ ў верасьні месяцы на раённых канферэнцыях асьветнікаў стала абгаварвалася пытаньне аб самаадукацыі асьветнікаў. Было даручана РМК і інспэктару асьветы складзьці праграму і своечасова разасланць яе на месцах, каб на ёй магчыма было зараз-жа распачаць працу.

Але вось ужо чаньверты месяц пасьля канферэнцыі, а падрады ўсё чакаюць праграм. Пытаньне самаадукацыі асьветнікаў, за якое горача ратавалі РМК і інспэктар асьветы, як відаць, пакінулі над сукно, а самі паснулі.

Ужо хутка палова навучальнага году, а асьветнікі чакаюць праграм.

Мак.

(Ветрынскі р., Полаччына).

У КУЛЬТУРНЫМ ПАХОДЗЕ.

Культурнае будаўніцтва ў Полаччыне.

Культурнае будаўніцтва ў полацкіх умовах набывае асаблівую важнасьць таму, што Полацкая акруга атрымала, у параўнаньні з іншымі акругамі Беларусі, надзвычайна дрэнную культурную спадчыну, ахварбаваную манастырска-касьцельным коле рам і працай інтэлігенцыі эвакуаванай у час імперыялістычнай вайны з Бушу. Віленскай вучэбнай акругі, якая працавала доўгі час пад вывескай апалітычнасьці і нейтральнасьці.

Да апошняга часу ў акрузе існуе яшчэ 81 царква, з лікам актыўных сяброў царкоўнага савету 495 чал., 10 касьцёлаў (70 сяброў савету), 39 сінагог (200 сяброў савету) і шмат іншых сектанскіх арганізацый, актыўнасьць якіх значна ўзрасла і далёка выходзіць за рамкі рэлігійнай прапаганды, бо маецца 670 актыўных рэлігійнікаў на акрузе.

Паказчыкам культурнай адсталасьці большай часткі насельніцтва зьяўляецца наступнае: маецца 57 проц. пісьменных мужчын, альбо 87166 чал., 72 пр. пісьменных жанчын, альбо 136501 чал. У сярэднім пісьменных па акрузе знаходзіцца да 60 проц. Ёсьць вялікая колькасьць дваро, якія ня маюць пісьменнага сябра ў сваёй гаспадарцы.

Усе памянёныя цяжкасьці ў галіне культурнага будаўніцтва па Полацкай акрузе неабходна паменшыць на прымежнасьць, беднасьць, разбураванасьць, шматнацыянальнасьць і адсутнасьць буйнай прамысловасьці.

Не апошнае месца займае і п'янка. Лічбы па Полацкай акрузе аб ужываньні алкаголю (толькі хлебнага віна) маюцца наступныя: па гораду за апошнія 11 месяцаў праз ЦРК і дзяржспірт, акрамя транспартнай каапэрацыі, выпіта 197636 літраў на 265830 руб ці 5 літраў і 8-9 руб. на душу. Насельніцтва акругі выпіла (акрамя самагону) 474040 літраў на 834310 р. Усяго, акрамя транспартнай каапэрацыі выпіта 611676 літраў на 1099929 р. Ня лепш абстаіць справа з п'янкай і на прадпрыемствах. Каапэрацыя заводу „Труды" на 700 рабочых (з 2000 членаў сям'і) за 10 апошніх месяцаў распрадала 16370 літраў гарэлкі, на 28811 руб., альбо на душу 13,1 р.

Магчымасьцяй для культурнага будаўніцтва ёсьць шмат, сродак толькі па галіне асьветы па бюджэту ў 1928-1929 г. прадугледжана 1462050 руб. ці 3,9 р. на душу.

Калі дадаць да бюджэтных сродкаў самаабкладваньне на культурныя патрэбы 67181 руб. грашыма і 20401 натурай, дык маючы такія грошы можна значна шэрай разгарнуць працу па культурнаму будаўніцтву. Аднак, сродкі самаабкладваньня на культурныя патрэбы на жаль узысканы толькі 69,2 пр. ці 63663 р., з якіх скарыстана 32193 р.

Культурныя сілы на Полаччыне маюцца не малыя. Працаўнікоў саюзу асьветы налічваецца 1399 чал., дактароў 87 чал., фэльчарскага персаналу 108 чал., акушэрчых і акушэрнікаў—56 чал., каморнікаў розных галін гаспадаркі 55 чал. і 65 агранамаў.

Колькасьць ахапленьня дзяцей школьнага ўзросту даведзена ў прымежных раёнах да 72 пр. і ў нянрымежных да 52 проц. У гэтым годзе па 7-мі раёнах і 70 насельніцкіх пунктах ёсьць магчымасьць увесьці ўсеагульнае навучаньне для 8-мігадовых дзяцей.

Дзяцей навучаецца (ад 8 да 12 год) па акрузе 16007 чал., ці 58,1 проц. а разам з перарослымі ў сьценах школ вучыцца 29.676 чал. Сацыяльны склад навучаючых 3-х і 4-хгодк. далёка не бядняцкі, а ў пераважнай большасьці дзеці серадняцкіх і заможных. Адсёў вучняў у працягу году падае на беднату і на шмат сямейных серадняцкіх. Ёсьць выпадкі, калі заможная частка сялян бае ў батраку вучняў, у той час, як свае дзеці займаюцца ў школах (Коханавічы-Сухаруківа) Камплектаваньне сяміклас вучнямі, асабліва 5 групы з сацыяльнага боку паляпшаецца кожны год. Але і тут у іншых раёнах былі выпадкі скрыўленьня дырэктыў партыі.

За апошнія гады ўся палітасьветная праца мала прыкоўвала ўвагі партыйных органаў на месцох. Дырэктывы выконваюцца слаба. Удзел у кампаніях палітасьветных устаноў хат-чытален, вардамоў і клюбаў слабы, часам нават ня мае належнай устаноўкі.

Грамадзкія арганізацыі ўдзелу ў культурным будаўніцтве амаль ня прымаюць.

Справа па ліквідацыі розных відаў пісьменнасьці і затрат накіравана за апошнія часы ў дзяржаўныя русы і нават сродкі скарыстоўваюцца больш па тэхпрацаўнікоў.

Па акрузе налічваецца 157 ячэек «Праф пісьменнасьць», з лікам 4310 сяброў. Але некаторыя з апошніх лічацца толькі на паперы. У бягучым навучальным годзе намечана ліквідаваць пісьменнасьць сярод 14000 чал. Каштарыс на ліквідацыю пісьменнасьці намечаўся з павялічэньнем на 98,6 проц. а зацьверджан толькі на 10 проц. больш.

Выпуск пісьменных з агульнага ліку навучаўшыхся 3807, невялікі—2873 чал.

Праца кіно, тэатру, клюбаў сходзіць на рэйкі самаакупаемасьці з буфэтамі скокамі і далёка ня вытрымлівае ідэалёгічнага боку. Антырэлігійных, выхаваўча-бытавых, вытворчых пастановак у рэпэртуары за апошнія часы амаль што няма.

Толькі агульнымі сіламі парыйных, прафэсыянальных, асьветных, грамадзкіх і камсамольскіх арганізацый будзе зроблен рашучы пералом у культурным будаўніцтве на Полаччыне.

Т. В.

Месячнік „За грамату" на Бабруйшчыне.

(Ліст з Бабруйску).

Правядзеньне месячніка «За грамату» на Бабруйскай акрузе ставіла сваёю мэтаю, наперадзе—папуляризацыю справы ліквідацыі пісьменнасьці; прыцягненьне насельніцтва да падняцьця свайго культурнага ўзроўню, пашырэньне ячэек таварыства «Праф Пісьменнасьць» і практычнае ажыцьцяўленьне справы ліквідацыі пісьменнасьці.

Бязумоўна, у правядзеньні гэтай работы павінны былі ўдзельнічаць усе арганізацыі, але, на вялікі жаль, на справе аказалася тое, што прафэсыянальныя саюзы і каапэрацыйныя арганізацыі ў правядзеньні месячніка зрабілі вельмі мала. Ня былі адчэны валежныя сродкі, ня былі мабілізаваны сілы на справу зьнішчэньня пісьменнасьці.

Трэба аддаць справядлівасьць, што ў провінцыі прафсаюзам і каапэрацыі камсамол прыняў актыўны ўдзел у правядзеньні месячніка. І, такім чынам на плячох камсамолу і таварыства „Праф Пісьменнасьць" прышлося несьці цяжар правядзімай работы.

Што-ж удалося зрабіць на акрузе ў час правядзеньня месячніка? Удалося правесьці па акрузе больш тысячы сходаў, прысьвечаных пытаньням прапаганды за грамату, прычым пераважная большасьць гэтых сходаў праводзілася ў вёсцы (855).

Працаўнікі райсаветаў таварыства «Праф Пісьменнасьць» рабілі выезды ў вёскі з мэтай прапаганды ідэй ліквідацыі пісьменнасьці. Такіх выездаў, згодна зьвестак 12 райёнаў, было праведзена 165.

Лічбы гэтыя гаворацъ, што праца ў часе месячніка праводзілася, а пагэтаму мы маем права паказаць і вынікі гэтай працы. Вось яны: па Чырвона-Слабодскаму раёну арганізавана новых 12 ячэек «ПН», па Клічаўскаму—9, па Бабруйскаму—4, па Жлобінскаму—9 і г. д. Усяго за час месячніка арганізавана 139 новых ячэек таварыства «Праф Пісьменнасьць», у якія ўцягнута новых 4052 сябры. Рост сяброў таварыстваў супроць таго, што было да месячніка наглядаецца на 4 тысячы асоб—больш чым на сто процантаў.

Што-ж датычыцца лікпунктаў, дык іх адчынена за час правядзеньня месячніка 421; школ малапісьменных адчынена 22, груп малапісьменных арганізавана 18. Па апошніх зьвестках гэтыя лікпункты абслугоўваюць 10795 чал.

Вось тут яскрав яскрава відаць роля прафсаюзаў і каапэрацыі ў правядзеньні месячніка. За сродкі саюзаў адчынена ўсяго 27 лікпунктаў, а за сродкі каапэрацыі толькі 3(!).

Цяпер аб сродках. Яны ў час месячніка зьбіраліся розным стасункам. Усяго сабрана 6278 р., але бяда ў тым, што ня ўсюды яны скарыстаны і ў іншых месцох ляжаць без руху.

Бязумоўна, дасягнутыя вынікі ў месячніку «За грамату» нельга прызнаць добрымі, бо яны маглі-б быць значна лепшымі, калі-б усе арганізацыі шчыра ўзяліся за правядзеньне месячніка.

А. Дамброўскі.

Бяз пустых слоў і рэзалюцый.

(З блёкноту культармейца).

Культурны паход Кругляанская пестачковая камсамольская арганізацыя сустрэла і правяла бяз пустых слоў і рэзалюцый.

Каб лепш адзначыць культурны паход, было пастановлена зрабіць культурны паход у вёску Міхейкава, самую адсталую як у культурнай, так і гаспадарчай галіне. Складзены штаб прыступіў да працы. Былі вышуканы сродкі для набыцьця некаторага матар'ялу, разьбіты брыгады. Праведзена два сходы міхейкаўцаў па пытаньні культурнага паходу. Усе далі сваю згоду на аказаньне дапамогі і паход быў назначан на суботу 24 лістапада а 6 гадзіне раніцы.

* * *

Раніца. Пагода ня спрыяла. Дуў моцны халодны ветар. І слупы сьнежнага пылу круціліся ў паветры і бяз літасьці сьцябалі вочы. А ўжо маладыя бадзёрыя галасы напаўнялі пардом. Крыху запазьніліся, вышлі ў 7 гадзін. Былі непаразуменьні з пажарнікамі, якія спачатку далі сваю згоду ехаць, а потым адмаўляліся, і наогул зьбіраліся туга.

У паходзе прынялі ўдзел: раённы агранам, ветэрынар, мэдыцына, школа, сямігодка з настаўнікамі, пажарнікі, арцель шаўцоў „Чырвоны саматужнік", цырульнік і шкляр. Усе накіраваліся на барацьбу з цемрай і некультурнасьцю.

Шмат было таўкучкі, калі прышлі ў вёску, шмат хто ня ведаў за што ўзяцца, але пры належным кіраўніцтве і разьбітых раней брыгад праца закіпела.

З шчырасьцю сустрэла нас школа на сьцяне быў вывешан лёзунг: «Шлём шчырае прывітаньне культурнаму паходу, які прынясе карысьць нашай вёсцы». Бяднейшым вучням было раздадзена: 88 сшыткаў, 40 алоўкаў, 12 буталачак чарніла, 30 пер'яў і 20 ручак.

Фэльчары аглядзелі 51 вучня, з якіх аказаліся 3 хворых, аглядзелі 59 сялянскіх, хат з якіх толькі 27 хат аказалася з маленькімі культурнымі навыкамі, 18-жа хат выглядалі месцамі склад'у і хляву, у адной з хат ня было ні фортачак, ні падвойных вакон. Звайшлося 8 хат, у якіх дымаходы выходзілі ў сенцы. Агледжана 32 хворых, якім аказана дапамога, якія дагэтуль і ня думалі зварочвацца ў лячэбніцу.

Цырульнікі абгалілі за дзень 59 чалавек. Шаўцы наладзілі 12 пар ботаў, бацінак і падбілі 4 пары новых падмётак з свайго матар'ялу.

Ветэрынар агледзеў у 60 дварох жывёлу, дзе аказалася з 70 коней 7 хворых, з 82 кароў—4 хворыя; з 173 авечак—2 хворыя і з 253 сьвіней—13 хворых.

Пад кіраўніцтвам агранома зроблена і паказальная дацкая кармушка, мерквалася ўцяпліць і зрабіць пакаўзны хлеў, але кепскае надвор'е не дазволіла гэтага зрабіць.

Абгароджана 3 студні.

Працуючы стол справак выдаў розных 7 справак. Праведзена было 2 гутаркі аб значэньні кас ашчаднасьці. Камсамольцамі суб'агентамі сабрана 30 падпісчыкаў на розныя выданьні газэт.

Увечары ў памяшканьні школы адбылося ўрачыстае пасяджэньне ў адзнаку закладкі культурным паходам грунту для адбудовы культурнае вёскі, і ў адзнаку адчыненьня чырвонага кутка, у які камсамольцы сабралі 256 кніжак і шмат розных плякатаў.

Сяляне, выступаючыя в падзнаку камсамольцам, казалі:

— Ні разу ня бачыла наша вёска такой урачыстасьці, якую бача сёньня.

Пасьля сходу сялянам была прадэманстравана кіно-карціна «Морока».

Міхась Дзергачоў.

м. Круглае, Аршаншчына.

Дапамагаем падшэфным школам.

Калектыў студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў камвузу Беларусі імя Леніна сумесна з курсамі камсамольскага актыву наладзілі нядзельнік у карысьць школы.

Нядзельнік праводзіўся ў працягу паловы лістапада—сьнежня па нядзелях. У нядзельніку прымала ўдзел 286 чалавек. Працаваўшыя выконвалі чорную работу ў унівэрсытэцкім горадку, на будоўлі Меншвю і на заводзе «Бальшавік». Заробак усіх складае 470 рублёў.

Акрамя гэтага, тыя людзі, якія па прычынах занятасьці ня прымалі ўдзел у нядзельніку, уносяць (студэнты) па 1 р. 50 к., а супрацоўнікі і выкладчыкі—заробак за гэты дзень працы. Разам з гэтым сума заработку будзе складаць каля 600 р.

Сабраныя грошы будуць скарыстаны для школ падшэфных камвузу Дудзіцкага і Вузьлянскага сельсаветаў Самахвалавіцкага раёну. Па гэтым грошы будуць здабыты прылады для школ, таксама падручнікі і сшыткі для дзяцей беднякоў.

Г. С.

ШКОЛА У БАРАЦЬБЕ ЗА БЕДНАТУ.

БЕДНАТА ПОЎНАСЬЦЮ НЕ СКАРЫСТОЎВАЕ СВАЙГО ПЕРАВАЖНАГА ПРАВА НА АСЬВЕТУ.—ВЯЛІКІ АДСЕЎ ВУЧНЁЎСКАЙ БЕДНАТЫ.—ЯК УСЁ НАСТАЎНІЦТВА РАЗУМЕЕ ЗАДАЧЫ ПА ЎЦЯГНЕНЬНЮ БЕДНАТЫ Ў ШКОЛУ.—«НАСТАЎНІК ПАВІНЕН УСІХ ВУЧЫЦЬ—І БЕДНЫХ І БАГАТЫХ».—НЯМА ПЭЎНАЙ ПЭДАГАГІЧНАЙ СЫСТЭМЫ ДЗЕЛЯ ДАПАМОГІ ВУЧНЁЎСКАЙ БЕДНАЦЕ.—ПЫТАНЬНЕ АХОПУ БЕДНАТЫ ШКОЛАЙ ВЫМАГАЕ БОЛЬШАЙ УВАГІ.

Яшчэ перад пачаткам сёлетняга навучальнага году мы на старонках „Савецкай Беларусі" і ў «Прапаўніку асьветы» нераз узьнімалі пытаньне аб ажыцьцяўленьні дырэктывы партыі і ўлады па ўцягненьню бядняцкіх і батрацкіх дзяцей у школу. Пытаньне гэта важнае і балючае: сялянская беднота і батрацтва, а таксама гарадзкія працоўныя пізы, маючы перавагу перад іншымі пластамі жыхарства на асьвету і выхаваньне, у запраўднасьці гэтай перавагі не карыстаюць у належнай меры.

Калі ў першай групе вясковай або гарадзкой школы беднота дасягае больш-менш значнага процанту, дык да канца школы гэты процант сходзе амаль на нішто—настолькі беднота адсяваецца са школы на працягу некалькіх гадоў вучобы. Гэта зьявішча амаль што аднолькава характэрна як для вясковых пачатковых школ, так і для вясковых і гарадзкіх самігодак.

Як і належыць быць, на ўзьнятае намі абгаварэньне пытаньня па ўцягненьню і замацаваньню беднаты ў школе адгукнулася савецкая грамадзкасьць і ў першую чаргу наша настаўніцтва. Пачалі паступаць у рэдакцыю допісы, у якіх асьветнікі выказваюць свае меркаваньні па закранутаму пытаньню, а таксама выкрываюцца тыя прычыны, што адцягваюць бядняцкую дзетвару ад школы і не даюць ёй магчымасьці цьвёрда стаць на грунт аднаваньня навукі і культуры. Прычын гэтых шмат, прычым амаль што ўсе дапісчыкі лічаць самай асноўнай з іх—эканамічнае становішча беднаты і батрацтва.

І запраўды, прычына гэта сталая, і не віяк нельга ня ўлічваць. Праўда, што селяніну-бедняку, або нарабку дяжка пратрымаць сваё дзіцянё ў школе да канца навучаньня, бо яму патрэбен працаўнік або ў сваёй гаспадарцы, або прыходзіцца пусьціць у заработкі да больш заможнага гаспадара. Калі-ж яшчэ дадаць, што бядняцкае дзіцянё і голае і босае, дык будзе зусім ясна, чаму беднота ня можа дасхаць да апошняй клясы і змушана пакінуць школу на паўдарозе.

Але-ж мы не павінны пакінуць гэту справу ў такім становішчы, як яна зараз ёсьць. Мы павінны зьнішчыць гэтыя эканамічныя прычыны, дапамагаючы бедноце вопраткай, абуткам, пісьмовымі прыладамі і г. д. Дзяржава ў бліжэйшыя гады ня зможа вылучыць на гэту справу значных сродкаў, а тыя асыгнаваньні, якія зараз адпускаюцца дзяржавай, ідуць пераважна на стыпэндыі і інтэрнаты для беднаты школ сялянскай моладзі і сямігодак. Таму школы, і асабліва першага канцэнтру, павінны паставіць першай сваёй задачай—узварушыць само насельніцтва, прыцягнуць грамадзкія сродкі на дапамогу школьнай беднаце.

Спосабаў да гэтага шмат. Тут можна скарыстаць і дабраахвотныя зборы і адлічэньні, і адлічэньні з каапэрацыйных фондаў, і ініцыятыву камітэтаў узаемадапамогі, і платныя школьныя вечары і г. д. Так некаторыя школы і робяць, што мы і бачым асабліва яскрава з прыкладу чэрвенскай сямігодкі (гл. «Сав. Беларусь» № 280).

Але ня ўсе настаўнікі мысляць так, як чэрвенцы. Некаторыя, і такіх шмат, каб не сказаць большасьць, яшчэ не расчухаліся і не зразумелі ўсёй значнасьці тых вынікаў, якія цягне за сабой адсеў беднаты з нашай школы. Дзеля ілюстрацыі гэтай катэгорыі інакш мыслячых возьмем быхаўскіх асьветнікаў.

Пра тое, як быхаўскія настаўнікі ўзяўляюць сабе справу ўцягненьня бядняцкіх дзяцей у школу, піша нам наш быхаўскі карэспандэнт Д. Ш. наступнае:

«На адным з гарадзкіх сходаў настаўнікаў на дакладу інспэктара было закранута пытаньне—чаму ў нашай школе вельмі мала дзяцей беднаты? Выступаўшыя ў спрэчках настаўнікі не згаджаліся з інспэктарам, які даказваў, што ў гэтым вінаваты настаўнікі. Яны казалі: настаўнік не вінават, што ў школах мала дзяцей беднаты, бо прычынай зьяўляецца эканамічнае становішча беднаты...

Настаўнік павінен усіх вучыць—і бедных і багатых, а калі дзіцянё бедняка прыходзе позна ў школу, дык бескарысна для яго-ж самога прымаць яго ў школу».

Проста і адкравенна—я не вінават, падкачала эканоміка. Ня буду-ж я, настаўнік, хадзіць па вуліцы і зьбіраць беднату ў школу?! А сам бляк ня ідзе вучыцца, а калі і прыдзе ды трохі запозьніцца, дык я яго, каб не перашкаджаў працаваць, проста-на-праста ня прыму ў школу, бо «бескарысна для яго-ж самога...»

Мы, бязумоўна, згодны, што ад разважаючага так настаўніцтва бядняцкая дзетвара набудзе мала карысьці. Але-ж на савецкую школу беднота мае права і нават у першую чаргу, і яе павінны ўцягнуць, усасаць у школу, і ўцягнуць своечасова, без спазьненьняў.

Нельга таксама згадзіцца і з таварышам інспэктарам, які ўсю віну імкнецца зваліць толькі на настаўнікаў, нічога не зрабіўшы дзеля ўзьняцьця яго палітычнай сьвядомасьці. А можа ён і сам трошкі вінават, што ня ўзьнімаў гэтага пытаньня раней і чакаў лістапада месяца? Разумеецца, тут вінават і інспэктар, і гарсавет, і райвыкавком, якія не абудзілі своечасова асьветнікаў, каб разам з імі, аг льнымі сіламі ўзяцца за штурмаваньне справы прыцягненьня беднаты да школы. Стараньнем і сумоўнай працай можна ўсё зрабіць, можна і бядняцкую «эканоміку» хоць крыху ўлагодзіць. А пераваліваньнем віны з галавы аднаго на галаву другога справе не дапаможаш. Пры такім становішчы ваша беднота будзе яшчэ шмат гадоў заставацца па-за школай.

Другая, ня менш важная, чымся эканамічная прычына слабай колькасьці беднаты сярод нашага вучнёўства—гэта адсутнасьць пэўнай педагагічнай сыстэмы, якая спрыяла-б замацаваньню дзяцей беднаты і батрацтва ў школе. Бядняцкае дзіцянё заўсёды горш разьвіта за дзіцянё а сям'і больш заможнага селяніна, або служачага. У справе разьвіцьця вучня адыгрывае вялікую ролю ня толькі школа, але і сям'я, хатнія абставіны, дамашні быт. І вось, уявіце сабе, якое разьвіцьцё дае вучню-бедняку яго хатні быт, прапітаны руцінай цемры і несьвядомасьці? Таму бядняцкія дзеці за звычай горш разьвіты за сваіх таварышоў з больш заможных сем'яў, таму яны і горш вучацца, адстаюць. А адгэтуль—другагодніцтва, адсеў беднаты са школы.

Што робіць школа, каб дапамагчы непасьпяваючай беднаце? Мы не памылімся, калі скажам, што у педагагічным сэнсе школа ня робіць нічога, або калі і робіць, дык, у кожным разе, вельмі мала. Настаўнік заўважае непасьпяваючых звычайна ў сярэдзіне, або пад канец году, калі справу ўжо пяжка паляпшыць. На вучнёўскую сядзіну трэба вывяртаць увагу з самага пачатку навучальнага году, не трэба мець на воку і ў працягу ўсяго году, у штодзённай працы школы.

У сваёй працы настаўнік павінен вылучаць больш слабых вучняў у пасобныя групы, дапамагаць ім у працы больш пільна, наладзіць вучнёўскую ўзаемадапамогу ў навучальнай справе.

Піянэрская арганізацыя і камсамольская ячэйка школы таксама павінны дапамагаць непасьпяваючым вучням-беднякам—гэта павінна стаць іхнай першачарговай задачай у справе дапамогі беднаце.

Школьныя рады таксама ні ў якім разе не павінны абмінаць пытаньня аб пасьпяховасьці вучняў-беднякоў. На сваіх пасяджэньнях яны павінны рашуча ставіць гэта пытаньне. Яны павінны дабіцца ад настаўнікаў педагагічнай дапамогі непасьпяваючым, яны павінны абудзіць творчую ініцыятыву ўсіх вучняў і вакіраваць яе на справу таварыскай дапамогі групам вучняў-беднякоў. І гэта трэба рабіць адразу ж, з самага пачатку навучальнага году, а не тады, калі ўжо рэзка вызначацца непасьпяваючыя, калі ўжо вырасьне вялікі хвост адсталай вучнёўскай беднаты, зьнішчыць які будзе ўжо немагчыма.

Ня гутаркамі, а справай трэба дапамагаць школьнай беднаце. Толькі пільнай сыстэматычнай працай мы прыкуём бядняцкую дзетвару да школы, толькі агульнымі сіламі зломім тыя рагаткі, што перапыняюць беднаце шырокі шлях да сьвятла, да культуры.

Матар'яльная дапамога і педагагічная пасьпяховасьць вучнёўскай беднаты—два асноўных пытаньні маленькай школы, вакол якіх павінна згуртавацца ўвага ўсёй грамадзкасьці і педагагічнай думкі.

Я. П.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР.

пра назначэньне т. Горына, Г. Ф., намесьнікам старшыні падрыхтоўчай камісіі СНК БССР.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе назначыць т. Горына, Грыгора Фэдусовіча, Намесьнікам Старшыні Падрыхтоўчай Камісіі СНК БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР А. Дубавіцкі.

5 сьнежня 1928 года, г. Менск.

Постановление Совета Народных Комиссаров БССР

о назначении т. Горина, Г. Ф. заместителем председателя подготовительной комиссии СНК БССР.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет назначить т. Горина, Григория Фабусовича, Заместителем Председателя Подготовительной Комиссии СНК БССР.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР А. Дубовицкий.

5 декабря, 1928 году, г. Менск.

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня 10-годзьдзя БССР.

18-га сьнежня пад старшынствам т. Хацкевіча адбылося пасяджэньне Цэнтральнай Камісіі ЦВК БССР па падрыхтоўцы да сьвяткаваньня 10-ці годзьдзя БССР з шырокім удзелам прадстаўнікоў ведамстваў і рэдактароў газэт. Камісія абмеркавала цэлы шэраг пытаньняў, зьвязаных з парадкам сьвяткаваньня і праядзеньня юбілейнай сэсіі, прысьвечанай сьвяткаваньню.

Члены і кандыдаты ў члены ЦВК павінны прыбыць у Менск не пазьней 30-га сьнежня з тым, каб яны маглі прыняць удзел у сьвяткаванні сумесна з рабочымі, служачымі і чырвонаармейцамі ў клюбах, на прадпрыёмствах, ва ўстановах і казармах.

Адчыненьне сэсіі ЦВК адбудзецца 31-га сьнежня ўвечары ў Доме Культуры.

Увечары, 1-га студзеня, у памяшканьні Беларускага Дзяржаўнага Тэатру адбудзецца ўрачыстае адчыненьне Беларускай Акадэміі Навук.

Для ўдзелу ў сьвяткаваньні запрашаюцца ў Менск дэлегацыі рабочых і работніц буйнейшых прадпрыёмстваў БССР, прадстаўнікі батракоў, батрачак, сялян і сялянак з усіх округ БССР. Апроч гэтага, ЦСПСБ і Менскі гарсавет запрашае для ўдзелу ў сьвяткаваньні 10-ці годзьдзя БССР прадстаўнікоў рабочых арганізацый буйнейшых гарадоў брацкіх Савецкіх Рэспублік.

Па думцы камісіі дзень 31-га сьнежня абвяшчаецца нерабочым днём, а пэнсія рабочым і служачым павінна быць выплачана не пазьней 28-га сьнежня.

У Белдзяржтэатры.

Масцном 1-га Беларускага Дзяржаўнага тэатру да сьвяткаваньня 10-годзьдзя рыхтуе арганізацыю масавага вечару, на якім, апрача дакладу аб дасягненьнях на культурна-гаспадарчым фронце БССР, будуць пастаўлены адрыўкі з розных п'ес. Гэтыя адрыўкі будуць ілюстраваць шлякі росту і разьвіцьця БДТ 1, пачынаючы з першых дзён яго існаваньня.

У музтэхнікуме.

У дні сьвяткаваньня 10-годзьдзя агалошэньня БССР у музтэхнікуме сіламі студэнтаў-тэхнікуму будзе наладжана ілюстрацыя працы апошняга з дню яго адчыненьня. Будзе паказана праца тэхнікуму, пачынаючы з гарманізацыі народнай беларускай песьні да ўтварэньня беларускай оперы.

Выпуск аднадзённай фотогазэты.

Да часу сьвяткаваньня 10-гіодзьдзя агалошэньня БССР выпускаецца аднадзённая фото-газэта.

У газэце будзе зьмешчан шэраг фатаграфій і „малюнкаў, характарызуючых дасягненьні БССР за 10 год.

Да пуску галянтарэйнай фабрыкі.

Да часу сьвяткаваньня 10-гіодзьдзя агалошэньня БССР будзе часткова пушчана ў ход новая галянтарэйная фабрыка.

На фабрыцы заканчваецца абсталяваньне корпусу на выпрацоўцы грабянёў.

Фабрыка электрыфікуецца.

У саюзе працмастацтва.

Саюз працаўнікоў мастацтва рыхтуе для членаў свайго саюзу агульнагарадзкі вечар, на якім будуць паказаны ўсе віды мастацтва: сымфанічны канцэрт, тэатральная пастаноўка, кіно, балет і інш.

У дні сьвяткаваньня 10-годзьдзя БССР сіламі саюзу будуць наладжаны мастацкія выступленьні ў казармах, шпіталях Чырвонай арміі, а таксама спэцыяльныя пастаноўкі для чырвоных байцоў у тэатры і кіно. Апрача таго саюз супольна з вынаходцам шафотва над вёскай правядзе выезд у падмаскоўную вёску.

Беларускі саматужна-прамысловы саюз—да часу сьвята.

Сьвята 10-гіодзьдзя агалошэньня БССР Беларускі саматужна-прамысловы саюз адзначае шэрагам нерапрыёмстваў.

Так, менскаму акруговаму саюзу запрапанавана адчыніць да часу сьвята вроцлы, каб на іх выпушчаную прадукцыю зрабіць зьнікоўкі з надпісам „10-гіодзьдзе БССР".

Капітальнае перааблсталяваньне заводу «Дрэвааапрацоўшчык».

Да часу сьвяткаваньня 10-гіодзьдзя агалошэньня БССР заканчваецца капітальнае перааблсталяваньне заводу „Дрэвааапрацоўшчык".

Усе працэсы вытворчасьці на фабрыцы электрыфікаваны.

Устаноўлены новыя вамежныя станкі.

Да пуску галянтарэйнай фабрыкі.

Да часу сьвяткаваньня 10-гіодзьдзя агалошэньня БССР выпускаецца аднадзённая фото-газэта.

У газэце будзе зьмешчан шэраг фатаграфій і „малюнкаў, характарызуючых дасягненьні БССР за 10 год.

Да пуску галянтарэйнай фабрыкі.

Да часу сьвяткаваньня 10-гіодзьдзя агалошэньня БССР будзе часткова пушчана ў ход новая галянтарэйная фабрыка.

На фабрыцы заканчваецца абсталяваньне корпусу на выпрацоўцы грабянёў.

Фабрыка электрыфікуецца.

З 1-га студзеня 1929 году цэнтральная газэта Ленінскага Камсамолу Беларусі „Чырвоная Зьмена" пачынае выходзіць штодзённа.

Падпісная месячная плата—самая таньная з усіх штодзённых газэт—30 капеек, а з дадаткам „фото-газэты" (2 разы ў месяц)—37 капеек.

ХРОНІКА.

Як будзе праводзіцца перарэгістрацыя пайшчыкаў ЦРК.

У бліжэйшыя дні працаўнікоў Менску, Віцебску, Гомелю і Магілеву прыступяць да перарэгістрацыі пайшчыкаў. Мэта перарэгістрацыі—вылавіць сапраўдны склад пайшчыкаў; выключыць з пайшчыкаў асоб, якія па закону і па статуту ня маюць права быць пайшчыкамі кааператывы; высьветліць дакладны лік утрымальцаў пайшчыкаў.

Перарэгістрацыя будзе праводзіцца па месцу работы пайшчыкаў ЦРК. Пайшчыкі, якія працуюць у дробных калектывах (да 15-25 чал.) і адзіночкі будуць рэгістравацца ў спэцыяльных пунктах па асобных раёнах і акраінах гораду, а таксама і пры праўленьні ЦРК. Перарэгістрацыя працягнецца максімум 2-3 месяцы і пасьля перарэгістрацыі выдача ўсіх дэфіцытных тавараў будзе праводзіцца выключна па новых, меншых. З моманту перарэгістрацыі ўсе разрахункі пайшчыкаў па палавых узносах будуць утварацца праз спэцыяльныя палавыя маркі.

Перарэгістрацыя пайшчыкаў в кампалітэкладу і чырвонаармейцаў будзе праводзіцца рэгістратарамі ЦРК пры непасрэдным удзеле вайсковых кааператыўных камісій у сваіх часьцях.

Мопр і інтэрнацыянальнае выхаваньне дзяцей.

Ад гэтага часу справы інтэрнацыянальнага выхаваньня дзяцей узьмелася мала ўвагі.

У сувязі з гэтым ЦК Мопр'у БССР сумесна з ЦБ юных піянэраў выпрацаваў шэраг мерапрыёмстваў па ўзмацненьні гэтай працы.

У далейшым уся ўсіх піянэратрадах і школах сацыяльнага пастаноўлена ўвесьці адзін раз у месяц «мопраўскую гадзіну», альбо «мопраўскі ўрок», на працягу якога сіламі настаўнікаў будуць праводзіцца гутаркі на прадметах Мопр'у. Ва ўсіх піянэрскіх клюбах і школах запрапанавана арганізаваць куты Мопр'у.

Менскаму акруговаму бюро юных піянэраў разам з Менскім акруговым Мопр'у запрапанавана ў плянавым парадку праводзіць на працягу ўсяго навучальнага году экскурсіі дзяцей для агляду мопраўскай выстаўкі ў ЦК Мопр'у.

Апрача гэтага, запрапанавана ўлягаць піянэраў лепшых школ у справу шэфства над дзіцячымі дамамі Мопр'у і палітэмігрантамі буржуазных турмаў, а таксама ў правядзеньне масавых палітыкампаній.

Дом пісьменьнікаў будзе адрамантаваны да 20 студзеня.

Зараз у доме пісьменьнікаў праводзіцца ўнутраны рамонт. Частка дому пісьменьнікаў будзе адчынена 10 студзеня, а ўвесь дом будзе адрамантаваны і абсталяваны да 20 студзеня. На абсталяваньне і ўтрыманьне дому Наркамадвоты адпусьціў 5000 руб. Пры доме будуць такі: чытальня, шахматна шашачны, залы для дыскусій, літаратурных вечароў і шэраг іншых.

Запрашэньне гасьцей на адчыненьне Беларускай Акадэміі Навук.

На ўрачыстае адчыненьне Беларускай Акадэміі Навук будзе запрошана каля 200 гасьцей, палова з якіх прыпадае на іншыя рэспублікі Савецкага Саюзу. Паданы запрашэньні Народным Камісарыятам Асьветы пэламу шэрагу рэспублік. Усесаюзнай і Украінскай Акадэміям Навук, прадстаўнікам уряду і розным культурным інстытутыцям.

Дапамога палітвязьням буржуазных турмаў.

Цэнтральны Камітэт Мопр'у БССР выслаў учора 10000 руб. на аказаньне дапамогі палітвязьням буржуазных турмаў.

Сродкі сабраны сярод працоўных БССР у час кампаніі зімовай дапамогі палітвязьням.

Друкары ў час калядаў будуць працаваць.

Агульны сход рабочых першай друкарні пастанавіў прапанаваць 25 сьнежня, а замест гэтага дню сьвяткаваць 31 сьнежня сьвята 10-годзьдзя БССР.

Такую-ж пастанову вынес агульны сход рабочых абойнай фабрыкі імя Варонскага.

Збор сродкаў на пабудову беларускага санітарнага самалёту.

Пленум Менскага акруговага камітэту беларускага т-ва Чырвонага Крыжу, які пядаўна скончыў сваю працу, асыгнаваў 500 руб. на пабудову беларускага санітарнага самалёту.

Усім раённым камітэтам і ячэйкам т-ва Чырвонага Крыжу запрапанавана распачаць збор сродкаў на пабудову гэтага самалёту.

Для пасьпяховага правядзеньня кампаніі па збору сродкаў на самалёт будуць праводзіцца вызавы прав друк, скарбовачныя зборы і інш.

III усебеларуская мастацкая выстаўка.

III усебеларуская мастацкая выстаўка будзе наладжана ў памяшканьні аўдыторыі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

Ужо паступіў шэраг заяў ад мастакоў Масквы, Ленінграду і іншых гарадоў аб жаданьні прыняць удзел у выстаўцы.

Арганізацыя ўзорнага магазыну ў Менску.

Белрабсакцыя вырашыла арганізаваць у Менску вопытна-паказальны магазын рабочай кааперацыі. Для гэтага магазыну будзе адшукана спэцыяльнае памяшканьне, заказана спэцыяльнае абсталяваньне і падабраны адпаведны штат працаўнікоў. Магазын будзе служыць узорам паказальнай працы на абслугоўваньню шырокіх колаў насельніцтва.

Антырэлігійны вечар.

У адзін з дзён калядаў мастацкім 1-га Беларускага Дзяржаўнага тэатру наладжвае вялікі антырэлігійны вечар з мастацкай ілюстрацыяй.

5-ы сымфанічны канцэрт.

5-ы сымфанічны канцэрт 17 сьнежня быў прысьвечаны творам П. І. Чайкоўскага з прычыны 35-й гадавіны з дня сьмерці гэтага кампазытара.

Уступныя словы аб жыцьці, творчасьці і сацыяльна-эканамічных і культурна-гістарычных фактарах, пад уплывам якіх фармавалася музычная асабістасьць геніяльнага кампазытара, сказаў вядомы музычны дасьледчык Ю. М. Дрэйзін; ён-жа даваў тлумачэньні аб кожным нумару праграмы.

У праграму ўвайшлі найбольш значныя і выдатныя сымфанічныя творы Чайкоўскага: увэртюра «Франчэска да-Рыміні», увэртюра „Ромэо і Джульета", сюіта з балету „Лебядзіное возера", сюіта «Шчаўкунчык» і інш.

Уся праграма была выканана вельмі ўдала. Тонкая, глыбокапрадуманая трактоўка сьведчыць аб тым, што аркестр вядзе вельмі ўмелая рука мастака-дырыжэра (М. В. Міхайлаў).

Да адмоўнага боку канцэрту трэба адносьці наступнае: 1 е)—малая вага, дрэнная ў адносінах акустыкі, прасталінейныя гукі, з прычыны чаго губляюцца тонкія нюансы, як, напр., pianissimo. 2-е—і самае галоўнае—гэта тое, што надзвычайна багаты вакальны бок творчасьці П. Чайкоўскага зусім ня быў прадстаўлены ў канцэрце, і ў слухача магло ўтварыцца ўражаньне, што Чайкоўскі быў кампазытарам выключна інструмэнтальнай музыкі, у той час, як ён зьяўляецца стваральнікам такіх опэрных шэдэўраў, як „Яўгэній Анегін", «Пікавая Дама», а гатэкгама «Мазэпа», «Чарэвічкі», «Опрычнік», „Панна", «Орлеанская дзева» і інш., ня кажучы аб шматлікіх рамансах.

М. Ніч.

На барацьбу з алкагалізмам.

Рост ініцыятыўных груп па барацьбе з алкагалізмам.

За апошні час назіраецца некаторае ажыўленьне ў працы менскага т-ва па барацьбе з алкагалізмам.

Так, зараз ужо арганізаваны ініцыятыўныя групы для арганізацыі ячэек на барацьбе з алкагалізмам. На 10 буйных прадпрыёмствах Менску (хлебазавод, завод „Бальшэвік", Эльвод, шпалерная фабрыка, завод «Беларусь» і інш.), т-ва вядзе працу па арганізацыі ініцыятыўных груп і на іншых прадпрыёмствах.

Выпуск інструктароў-арганізатараў ячэек па барацьбе з алкагалізмам.

Гэтымі днямі закончылі сваю працу курсы па падрыхтоўцы інструктароў-арганізатараў ячэек па барацьбе з алкагалізмам.

Усяго скончылі гэтыя курсы 35 чалавек.

Скончыўшыя будуць выкарыстаны на працы па арганізацыі ячэек т-ва па барацьбе з алкагалізмам на прадпрыёмствах.

Выстаўкі — перасоўкі па барацьбе з алкагалізмам.

У мэтах сапраўднічэньня барацьбе з алкагалізмам, Менскі акруговы камітэт беларускага т-ва Чырвонага Крыжу пасылае ў Барысаўскі, Койданаўскі і Смалявіцкі раёны выстаўку-перасоўку па барацьбе з алкагалізмам.

Выстаўка-перасоўка працуе ў кожным раёне па 2 месяцы.

Утварэньне хлэбнага фонду.

Праўленьне Белкавансаюзу пастанавіла ўтварыць хлебныя фонды на райсаюзах спажывецкай кааперацыі і ізраіцкім БССР. У Віцебску будзе ўтвораны фонд у 100000 пуд., у Менску—165000 пуд., у Гомелі—100000 пуд. і г. д. На ўсіх працаўнікоў БССР хлебны фонд будзе ўтвораны ў колькасці 700000 пуд.—на райсаюзах у 500000 пуд. і у месцовым рэзерве будзе пакінута 400000 пуд.

Белкавансаюз даў на месцы інструкцыю аб заваньні гэтага фонду.

Тэмп паявой кампаніі аслабеў.

За кастрычнік, лістапад і першую дэкаду сьнежня па ўсіх працаўнікоў БССР сабрана палавых узносаў 150.582 руб., ці 50,2 проц. заданьня. Калі пагледзець, як ішоў збор палавых узносаў на асобных месцах, дык прыдзецца адзначыць, што тэмп паявой кампаніі аслабеў. Так, у кастрычніку сабрана 70.677 руб., у лістападзе—58184 руб. і за першую дэкаду сьнежня—21721 руб. Прыняты шэраг захадаў да ўзмацненьня тэмпу паявой кампаніі.

Суд.

ПРЫХІЛЬНІК ДА ПРЫВАТНІКА.

На пасаду загадчыка крамы транспартнага спажывецкага таварыства пры ст. Негарэлае быў прызначаны Паўла Пятроў Дзямідовіч.

Мясцовая ячэйка ЛКСМ, выстаўляючы кандыдатуру Дзямідовіча на гэтую пасаду, спасылалася, што Дзямідовіч будзе добрым і сумленным працаўніком спажывецкай кааперацыі. Адпак Дзямідовіч тое даверэ, якое даручыла яму камсамольская арганізацыя, не апраўдаў.

На працягу 1927 і 1928 гадоў Дзямідовіч зьвязваўся з прыватнікі гандлярамі і партыямі збываў дэфіцытныя тавары, напрыклад: муку, цукор, масла і мануфактуру.

Калі заходзілі ў краму, якой кіраваў Дзямідовіч, спажыўцы і прасілі Дзямідовіча адпусьціць їм муки, Дзямідовіч усялякімі спосабамі адмаўляўся і казаў, што мукі і цукру няма, цэлы крызіс.

Пры такой пастаноўцы справы камбінат па хлебазагатоўках праходзіла падта сонна і вынайдена ня была, покуль ня выгналі з крамы Дзямідовіча і не аддалі яго суду.

Менскі Акруговы Суд, на аснове 1 ч. 106 і 141 арт. арт. КК, прыгаварыў: Паўла Пятрова Дзямідовіча на адзін год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем без пазбаўленьня ў правах.

К.

Новы парадак кантраляваньня ўстаноў і прадпрыёмстваў.

Да апошніх часоў назіраліся выпадкі, калі кантроль іншых устаноў утвараўся вельмі часта і без плану.

РСІ лічыць такое зьявішча ненармальным і таму пастанавіла.

Прамысловыя прадпрыёмствы рэспубліканскага значэньня могуць быць абсьледаваны толькі з дазволу НКРСІ БССР. Без дазволу прадпрыёмствы могуць быць абсьледаваны правасой і спэц. інспэкцыямі працы і трэстам.

Тані-ж парадак устанаўліваецца ў адносінах да месцовае прамысловасьці, якая абсьледуецца з дазволу акр. РСІ.

Цэнтральныя, саюзарэгульныя, гандлёвыя аб'яднаньні могуць абсьледаваць свае філіялы і аддаленьні, ці акруговыя цэнтры ў плянавым парадку з дазволу НК РСІ, прычым да пачатку абсьледаваньня ставіць у сьведамасьць адпаведнае акр. РСІ. Аб'екты раённага значэньня, ці мізэвыя органы могуць быць абсьледаваны па ўзгадненьні з акр. РСІ.

Наркаматы і цэнтральныя ўстановы, якія знаходзяцца на бюджэце, узгадняюць з НК РСІ аб'екты абсьледаваньня, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце ў адносінах да ўстаноў, якія знаходзяцца на месцовым бюджэце, НК РСІ дае згаду толькі па тых округах, на якіх праводзіцца абсьледаваньне. Канкрэтныя-ж аб'екты ўзгадняюцца з акр. РСІ.

Пры выездах у округі абсьледавацелі назіраны зьяўляцца ў акр. РСІ для інфармаваньня аб абсьледаваньні.

Водгукі на карэспандэнцыі.

БЕЛСЕЛЬТРЭСТ РАСТЛУМАЧВАЕ.

На заметку—Пастанова аб сіласаваньні кармоў засталася на паперы (гл. С. Б. № 263 ад 16-XI—28 г.) Белсельтрэст дае наступнае тлумачэньне.

На пабудову сіласных ям (памятовых) патрэбны грунтоўныя сродкі, якія ня былі прадугледжаны кашторысам бягучага году і толькі ў пачаткавым годзе ва гэту патрэбу будуць адпушчаны па кашторысу патрэбныя сродкі.

Бягучы год ня спрыяў кліматычнымі ўмовамі сіласаваньню кармоў. У большасьці округ бульбяніх ахапіў мароз, а зялёны ліст яго быў сваочасова скормлен. У некаторых сагасах няма аб'екту для сіласаваньня. Адпак, Белсельтрэстам рабіліся адпаведныя захады. Сілясныя ямы ёсьць у сагасах: Межаева (Аршанская акр.). Адамочках (Віцебская акр.). Таксама зроблены распараджэньні сагасам Каралёва, Кухчыны і Шыкатовічы Менская акр. аб пабудове памянёных ям.

СПРАВЫ РЭЙШАЛЯ БУДУЦЬ ПАДРАБЯЗНА ВЫСЬВЕТЛЕНЫ.

У допісу „Юбілей самігадовай справы", зьмешчаны ў № 263 „С. Б." ад 16 лістапада г. г., у якім паведамляхася, як Рэйшаль карыстаецца маёмтвам былога абшарніка Паклоўскага, ня сьлядячы на адпаведныя пастановы аб перадачы будынкаў спажывецкаму т-ву, і ніхто нічога ня можа зрабіць з Рэйшалям.

Пэмпракурора рэспублікі паведамляе, што гр. Рэйшаль ганёр 22 жніўня г. г., а яго дачка падала ў пракуратуру рэспублікі скаргу аб незаконным валіцьбе ў дзяржаўнасьць будынкаў. Да заяў прыкладзены дакумэнты, аб тым, што Рэйшаль селянін былы кухар на роду заняткаў. Ён купіў у 1907 г. ад абшарніка Камчалоўскага фальварак Конаўчыцы. Зараз ва Рэйшалем ліча па будынкі і 8,5 дзесяцін зямлі, якая замацавана ў працоўнае карыстаньне. Па падставе інструкцыі гэта мае масьць ня можа быць канфіскавана. Пракуратура рэспублікі запрапанавала скасаваць вынос будынкаў і запатрабавала гэту справу ў парадку нагляду для падрабязнага высьвятленьня ня аклічаньняй.

ПЕРААБРАЛІ ПРАЎЛЕНЬНЕ.

6 чэрвеня г. г. у № 128 «С. Б» быў зьмешчан допіс Я. Лукяновіча.—У праўленьні друкуць кулаки. У допісу гаварылася аб подкопах праці Жэрэвінскага лесгарадзкага т-ва, Парыцкага р-ну, Бабр. акрэсі, якое эксплюатавала бедноту і конска скарыстоўвала крэдыты. Бабруйскі акруговы выканьны аддзел паведамляе, што значная праца, якая праводзілася т-вам, аплачвалася праўленьнем на падставе дагавору з рабочымі. Рабочыя зарабілі ў дзень ня менш 3 рублёў. Утаўшаваных у т-ве налічваецца 15 чал. 26 жніўня г. г. зроблены перавыбары праўленьня т-ва, у склад якога ўвайшоў б. батрак—старшыня Карбут Сьцяпан (плаціць падатку за 5 руб.).

Новае праўленьне вядзе спагнаньне ўзносінаў капітал з сваіх пайшчыкаў.

АСОБНАЯ КАЛЕГІЯ ВЫШЭЙШАГА КАНТРОЛЮ СКАЖА СВАЁ СЛОВА.

У допісу: „Хто тут шпацэт", зьмешч. у № 217 «С. Б.» ад 20 верасьня, паведамляецца, як Смалявіцкі РВК аддаў у арэнду возера рыбалоўнай арцелі і дазволіў ёй карыстацца набярэжнай сенажаткі. Але пры некаторых час, на загаду РВК сенажаць зноў была перададзена былому карыстальніку Красьмеру Іорку.

На гэты допіс Менскі Акраз паведамляе наступнае: У заключэньні дагавору аддзел РВК і ар ольно значыцца пушчы, што арцель прадаставала для карыстаньня 10 сак. набярэжна для сушкі рыбалоўных прыпасаў і іншых патрэб, выключаючы касьбу сенажаці, занятую будынкамі і насьпечамі, што адпаведна подна-мелярыйнаму плану. Арцель скасіла сенажаць, якой карыстаўся Красьмер. Справа аб замацаваньні сенажаці за Красьмерам знаходзіцца ў Любэй Замежнай Калегіі Вым. Кантролю.

Адказы на карэспандэнцыі.

Іванові Андрэю. Ваша абвяржэньне не падцьвярджаецца. Т. Уцэка можа прыцягнуць вас за хлусьню да судовай адказнасьці.

Л. Барабанаву. Бацуньскае с.-г. прадпрыемства-т-ва (Уваравіцкага р-ну) адказвае, што посёлак Стара-Жэзьляна, Чабатовіцкага с.-с. у асеньнюю сяўбу атрымаў насеннага жыта 4990 кілё, якімі занятрабаваны гр. былі задаволены.

Стэпану. На допіс аб „Арэшанскім помпе грудзкога дзіцяці" інспэктура ШКА па сацыяльнаму выхаваньню паведамляе, што пакінуньне для дому знойдзена ўсім добрае.

„Аршанчыне на шляху сак. буд."—на побудзе.

Бачыце Анатольяну. Допіс аб хабары не пацьвярджаецца. Пагледзячы на даваньне вінаватым ня выяўлены, справа спынена.

Настаўніку. Допіс—«Я яму пакажу выключэньне», які быў зьмешчаны 28-XI-27 г. у «С Б» на паведамленьню Мен. АКК РСІ не пацьвярджаецца. Райінспэктар Лазарчык на абгаворваньні сказу выключаў на пасядзе, мясцовым на прысутнічаў.

Аўтару допісу па справе гр-на Шордса і Бокчыка пракуратура рэспублікі адказвае, што пракурорам Бабруйскай акругі ў парадку нагляду ўнесен пратэст у пленум Бабруйск. акруговага суду.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца парада камсамольцаў сяброў групкому і мясцовага працаўсьветы гор. Менску.

Сёньня 20-12 а 6 гадз. увеч. адбудзецца паседжаньне масавай камісіі дому.

А 7 гадз. увеч. сход клюбных уплыўмасаных.

Лекцыя на тэму «Механіка гаўчэсга шэгу».

Пасьля лекцыі, кіно. Пач. 8 гадз.

Уваход па клюбных білетах.

ПЭДГАБІНЭТ.

— У чацьвер, 20 сьнежня, роўна а 7-й гадзіне ўвечары адбудзецца паседжаньне сэкцыі грамадзка-карысной працы школы.

Па парадку дня: агляд літаратуры па грамадзка-карысной працы школы.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ТЭАТР—КІНО.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.

ЧАЦЬВЕР 20 сьнежня.

Спэктакль, перанесены з 18 сьнежня, аб'яднанай прафшколы мэталістых і дрэвааапрацоўшчыкаў

„НАД НЁМНАМ".

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». Мастацкі фільм „Два бранявікі". Звыш праграмы: гастролі БАРЫСА РЭНСКАГА.

КІНО «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА». „Скрыпач з Флёрэнцыі" з удзелам КОНРАДА ВЭЙДТ. ХУТКА! Гістарычны фільм «КАБІРЫЯ».

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Мастацкі фільм „Абрэк-Заур" у 10 часткак.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». З цікавыя фільмы: 1) «І МЫ ЯК ЛЮДЗІ» 2) „ЗНАХОДЛІВЫ ПРЫХІЛЬНІК" 3) „ПЕСЬНЯ САЛАЎЯ".

—) НА ПАДСТАВЕ § 64 СТАТУТУ (—

ПРАЎЛЕНЬНЕ БЕЛАРУСКАГА БАНКУ КАМУНАЛЬНАЕ ГАСПАДАРКІ І ЖЫЛІШЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

гэтым даводзіць да ведама Акцыянэраў Банку, што на 5 СТУДЗЕНЯ 1929 году а 6 гадзіне ўвечары

СКЛІКАЕЦЦА

АГУЛЬНЫ СХОД АКЦЫЯНЭРАЎ БЕЛКАМУНБАНКУ

Агульны сход адбудзецца ў памяшканьні банку (Ленінская, 36-43).

Пытаньні, якія падлягаюць абгаварэньню і вырашэньню сходу:

1) Даклад праўленьня, заключэньне рэвіз. камісіі аб працы Банка за 1927-28 г. і зацьвярджэньне гадавой справаздачы.

2) Размеркаваньне прыбыткаў.

3) Выбары савету, праўленьня і рэвіз. камісіі.

4) Інфармацыйнае паведамленьне аб праходжаньні плану доўгатэрміновага крэдытаваньня на 1928-29 г.

5) Бягучыя справы.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

АДКРЫТА ПАДПІСКА

на 1929 год

НА ШТОДЗЁННУЮ ЦЭНТРАЛЬНУЮ БЕЛАРУСКУЮ ГАЗЭТУ

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

ОРГАН ЦВК БЕЛАРУСІ.

15 студзеня 1929 г.—РОЗЫГРЫШ ЛЁТАРЭІ.

БУДЗЕ РАЗЫГРАНА 50 КАШТОЎНЫХ РЭЧАЎ

Усе, што падпішуцца на 6 мес., атрымаюць бясплатна 1 білет. на 1 год., атрымаюць 3 білеты.

У лётарэі будуць удзельнічаць толькі індывідуальныя падпісчыкі.

ЛЁТАРЭЙНЫЯ БІЛЕТЫ ВЫСЫЛАЮЦЦА ПА АТРЫМАНЬНІ КВІТКА АБ ЗДАЧЫ ПАДПІСКІ.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА

да 10 чысла падпіснога месяца.

Уся падпіска, якая паступіць пасьля 10 чысла, будзе пераносіцца на наступны падпісны месяц.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

на 1 месяц—90 кап., на 6 месяцаў—4 руб., на год—8 рублёў.

Гомельскі Акруговы Выканаўчы Камітэт з жалем выказвае сваё спачуваньне аб несваячасовай сьмерці Старшыні Мазырскага Акрвыканкому і кандыдата ў члены ЦВК БССР тав.

ЦЫГАНКОВА ІВАНА ЯУХІМАВІЧА.

Калектыў Менскай школы імя Чарвякова МБВ чыг. выказвае спачуваньне

тав. ВАДЭЙКА

з прычыны сьмерці яго брата-настаўніка.

Выйшла з друку часопісь „УЗВЫШША" № 5 (11) Рассылаецца падпісчыкам і продаецца у кнігарнях

—) У ЧАСОПІСІ НАДРУКАВАНА (—

Лукаш Калюга—„Ні госьць ні гаспадар"—аповесьць.
Максім Лужанін—«Госьці"—апавяданьне.
Зьмітрок Бядуля—«Язэп Крушынскі»—аповесьць.
Уладзімер Жадыка—вершы.
Васіль Шашалевіч—«Сумны вывер»—нарыс да драмы.
Пятро Глебка—вершы.
Максім Лужанін—вершы.
Уладзімер Жылка—вершы.
Юры Бярозка—„Пытаньні сучаснага марксыцкага вывучэньня літаратуры".
Ант. Адамовіч—«Максім Гарэцкі».

КУЛЬТУРА МОВЫ.

Кузьма Чорны—«Небеларуская мова ў беларускай літаратуры»
Уладзімер Дубоўка—«Беларускі вугал «дз» і літара «зэдо».
Ян. Бялькевіч—«Карэктыва да слова «месяц».
К. Вашына—«Пра чужыя словы і абароты».
Кнігапіс—Кузьма Чорны, Е. З-ны.

Друкуецца „УЗВЫШША" № 6(12)—ВЫЙДЗЕ з друку апошнія дні СЬНЕЖНЯ ПІДПІСВАЙЦЕСЯ НА 1929 Г. на часопісь «УЗВЫШША»

Пры падпісцы на 1929 г. часопісь будзе каштаваць 5 р. замест ранейшых 7 р. і буд е даваць 10 нумароў на год, замест ранейшых 6 нумароў на год

Выпісвайце кніжкі «УЗВЫШША»
З. Бядуля—Танэлія (пэмкі)
П. Глебка—Шыпшына (лірыка).
Абедзьве кніжкі разам пры падпісцы каштуюць 50 кап.

Галоўлітбел 302. Менск, дзяржаўная друкарня.